Пралетарыі усіх краёў, злучайцеся!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца з 9-й да 3½ гадз. Незапатрабаваныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародзяе — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок паперадні пасьля тэксту — р. 50 к. За радок паперадні пасьля тэксту 1 р. — к. За радок паперадні перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпісныя на 50 проц. дарожай. Зьніж тарыфу бярэцца 10 проц. шкоды.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант 35 кап. За кожны дадатковы 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант 15 „ За кожны дадатковы 5 „ Публікацыі ЗАГО'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Белпошты і ва ўсіх пункт. гал. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 135 (2323) Чацьвер, 14-га чэрвеня 1928 г.

Падрыхтуемся да спатканьня новага ўраджаю.

Бліжэйшыя два-тры месяцы павінны зьявіцца пэрыядам вельмі і вельмі адказнай гаспадарчай працы. Перад намі стаіць задача ўсебакова падрыхтавацца да спатканьня новага ўраджаю. Вопыт мінулых гадоў паказвае, што гэта задача ня можа быць адкладзена да апошняга моманту і што неабходнай умовай яе правільнага вырашэньня зьяўляецца своечасовае прыкладзеньне ў рух усіх асноўных рычагоў нашай гаспадарчай палітыкі па загадзя абдуманаму і добра абмеркаванаму пляну.

Асноўнае, рашучае значэньне ў справе падрыхтоўкі да новай с.-г. кампаніі мае пытаньне аб стварэньні мінімальна-неабходных таварных рэзэрваў прамысловае прадукцыі. Зусім ясна, што пры адсутнасьці гэткіх рэзэрваў мы ня зможам супрацьставіць наступаючай на рынак масе с.-г. прадукту адпаведную колькасьць прамтавараў і стварыць, такім чынам, асноўныя прадпасылкі для плянамернае загатоўчае працы.

Якое ў гэтай адносіне фактычнае становішча рэчаў і якія бліжэйшыя пэрспэктывы?

Плян разгортваньня прамысловасьці сёлета прадугледжвае павялічэньне выпуску прамысловае прадукцыі на 23 проц. у параўнаньні з леташнім годам. Пры гэтым выраб рэчаў шырокага ўжываньня павінен даць яшчэ больш процант росту, а іменна 27 проц. проці 15 проц. у мінулым годзе. Такім чынам, пры ўмовах выкананьня гэтага прамфінпляну прамысловасьці мы мелі-б поўную магчымасьць зрабіць поўныя таварныя запасы, тым больш, што ў сучасны момант на рынку назіраецца некаторае зацішша і значнае паслабленьне попыту. Тады паўстала-б пытаньне аб прадастаўленьні прадпрыемствам накапляючым таварныя запасы дадатковых сродкаў на гэтую мэту.

Вынікі развіцьця прамысловасьці за першае паўгодзьдзе бягучага году былі больш-менш спрыяючыя і давалі магчымасьць разьлічваць, што запраектаваны ў прамфінпляне рост вытворчасьці будзе зусім рэальным. Валавая выпрацоўка прамысловасьці за першае паўгодзьдзе павялічылася на 21,2 проц. у даваенных цэнах, у параўнаньні з адпаведным пэрыядам леташняга году, а март нават даў рост вытворчасьці на 26,7 проц. у параўнаньні з мартаўскімі вынікамі леташняга году. Паколькі адпачасна быў праведзен шэраг мер па зьмягчэньню звычайнага сэзоннага зьніжэньня вытворчасьці ў другім паўгодзьдзі, выкананьне прамфінпляну можна было лічыць пры гэткіх умовах амаль зусім забясьпечаным.

Аднак, у красавіку ў галіне прамысловай вытворчасьці стварыўся досыць востры пералом, які выклікаў трывогу за магчымасьць дасягненьня запраэктаванага прыросту валавай выпрацоўкі. Кошт валавай прадукцыі ў красавіку зьнізіўся ў параўнаньні з сакавіком на 12,5 проц., прычым на групе галін, вырабляючых рэчы шырокага ўжываньня, гэтае зьніжэньне дасягнула 13,5 проц. Праўда, у красавіку мы маем цэлы шэраг спэцыфічных прычын, якія часткова тлумачаць гэтае зьявішча: сьвяты, рамонты прадпрыемстваў, неахопы адпіў рабочых на палявыя работы і г. д. Але ўсё-ж у мінулыя гады зьніжэньне вытворчасьці ў красавіку складае ня больш 5-6 проц., і тут, як відаць, значную ролю грае шэраг іншых прычын, апроч прычын сэзоннага характару. У прыватнасьці, матар'ялы, якія маюцца, пакавяваюць, што найбольшае значэньне ў зьніжэньні росту валавай прадукцыі мелі, з аднаго боку, зьмяншэньне сярэдняй выпрацоўкі на аднаго рабочага, а з другога—некаторае затрыманьне вытворчасьці ў зьвязку з паслабленьнем нізавога попыту на крампрадукцыю, якое выявілася яшчэ ў сакавіку і ня спыняецца да сучаснага моманту.

Ня прыходзіцца падкрэсьліваць, што гэткае затрыманьне вытворчасьці зьяўляецца абсалютна недапушчальным і ні ў якой ступені не адпавядае нашым асноўным задачам па падрыхтоўцы новай с.-г. кампаніі. У той жа час гэта даводзіць магчымасьць і неабходнасьць хутка выправіць гэтае становішча. Дырэктыва аб усямерным росьце прамысловай вытворчасьці застаецца ў поўнай моцы, і на гэтую дырэктыву неабходна зьвярнуць усю ўвагу ня толькі працаўнікоў прамысловасьці, але і нашай грамадзкасьці. Стварэньне мінімальна неабходных рэзэрваў прамтавараў у момант рэалізацыі новага ўраджаю будзе ў значнай ступені залежаць ад стараніны, якія ў мэтах узмацненьня прамысловай вытворчасьці будуць учынены ня толькі з боку гаспадарчых органаў, але і прафэсыянальных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый.

ГАМІНДАН ПРАДАЎСЯ ІМПЭРЫЯЛІСТАМ.

ТОЛЬКІ РАБОЧЫЯ МОГУЦЬ ДАБІЦЦА НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ КІТАЮ

Адозва кітайскае фэдэрацыі Працы ў Шанхаі.

МАСКВА, 13-VI. У агалошанай адозьве кітайскае фэдэрацыі працы ў Шанхаі гаворыцца:

„Японскі імпэрыялізм уварваўся ў Кітай вялізарнай арміяй і спрабуе адарваць новы кавалак ад нашага краю. Разграміўшы ў сваім краі рэвалюцыйныя рабоча-сялянскія арганізацыі, кінуўшы ў астрогі тысячы перадавых барацьбітоў рабочае клясы, затапіўшы ў крыві рэвалюцыйны рух у Кіраі і на выспе Фармоза, архі-рэакцыйны ўрад Танакі кінуў буйныя ўзброеныя сілы, думаючы, як відаць, што на гэты раз прышоў час праглынуць той ласы кавалак, які столькі разоў станавіўся ўпоперак у яго імпэрыялістычным горле.

Японскі імпэрыялізм зьяўляецца заядлым ворагам кітайскае рэвалюцыі. Японскі імпэрыялізм абнаглеў цяпер, таму што ізноў знайшоў здраднікаў, якія з-за ўласнае карысьці гатовы разьднаць, прадаць край, прадаць кітайскі народ. Гамінадан,—восьмі хто зьяўляецца новаю мілітарыстычнаю зграяю, новым паслугачом сусьветнага імпэрыялізму.

Выкананьне загад з Токіё і з Лондану, Гамінадан парваў дыпляматычныя адносіны з СССР,—адзіным магутным прыпцелем кітайскае рэвалюцыі. Імпэрыялісты пачалі адчуваць сабе мацней, яны ўпэўнены, што Гамінадан пазбавіў кітайскі народ магчымасьці змагацца супраць інтэрвэнцыі, момант для інтэрвэнцыі без усякага сур'ёзнае рызыкі для сябе.

Сярод тых, што змагаюцца проці імпэрыялізму, толькі рабочыя зьяўляюцца найбольш рашучымі, найбольш пасьлядоўнымі і могуць наносіць найбольш магутныя ўдары. Рабочыя павінны аб'яднаць свае сілы. Толькі рабочыя могуць кіраваць барацьбою за незалежнасьць, барацьбою проці імпэрыялізму і яго агентаў у асобе Гамінадану.

На дапамогу кітайскаму рабочаму руху.

МІЖНАРОДНЫ РАБОЧЫ 2-ХТЫДНЁВІК.

МАСКВА. 12-6. Выканаўчае Бюро Прафінтэрну пастанавіла арганізаваць ад 17 да 31 ліпеня міжнародны двухтыднёвік дапамогі кітайскому рабочаму руху. Выканаўчае Бюро патрабуе ад усіх арганізацый Прафінтэрну разгарнуць шырокую масавую кампанію дапамогі кітайскаму пралетарыяту. Трэба азнаёміць шырокія масы з падзеямі, якія адбываюцца ў Кітаі, трэба шляхам мітынгаў, дэманстрацый, спэцыяльных нумароў газэт, лятучак і асабліва грашовых зборaў падаць рэальную дапамогу кітайскаму пралетарыяту.

Чан-Кай-Шы дамагаецца адстаўкі.

ШАНХАЙ, 12-6. Нанкінскі ўрад адхіліў просьбу Чан-Кай-Шы аб вызваленьні яго ад пасады галоўнакамандуючага арміяй і старшыні вайсковае рады. Пасьля гэтага Чан-Кай-Шы ізноў падаў заяву, у якой просіць вызваліць яго ад пасады старшыні палітычнае рады нанкінскага ўраду. Мяркуюць, што нанкінскі ўрад адхіліць просьбу Чан-Кай-Шы.

Цянцьзін пакінут мукдэнцамі.

У ГОРАДЗЕ РАБУНКІ.

ШАНХАЙ, 12-VI. Як паведамляюць з Пекіну, равейшы губарнатар шандуньскае правінцыі Чжан-Цзун-Чан вывеў свае войска з Цянцьзіну. На ўсіх уродавых будынках Цянцьзіну ўзьняты гаміндананўскія сьцягі.

Цянцьзінскі карэспандэнт агэнцтва Тохо ў тэрміновай тэлеграме паведамляе, што ў Цянцьзіне пачаліся рабункі, якія чыніць адступаючае войска.

Камуністычныя плякаты ў Пекіне.

ПЕКІН. Водлуг паведамленьня з кітайскіх крыніц, на некаторых вуліцах Пекіну зьявіліся плякаты з камуністычнымі лёзунгамі. Паліцыя ўчыніла шмат арыштаў.

РУХ ЗА БАЙКОТ ЯПОНІІ ШЫРЫЦЦА.

ШАНХАЙ, 12-VI. Сёньня ў Шанхаі адбыўся мітынг, скліканы камітэтам, які кіруе антыяпонскім рухам. Мітынг ухваліў патрабаваць ад нанкінскага ўраду звольніць з працы кітайскіх судзьдзяў, якія караюць інспэктараў, канфіскуючых японскія тавары. Мітынг пастанавіў саджаць у драўняныя клеткі кітайскіх купцоў, якія ня спынілі гандляваць японскімі таварамі.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ АБ СЬМЕРЦІ ЧЖАН-ЦЗО-ЛІНА.

ШАНХАЙ, 12-VI. Як паведамляюць з Токіё, у японскім вайсковым міністэрстве атрыманы весткі аб сьмерці Чжан-Цзо-Ліна

Ля апошняе мяжы прадажніцтва.

(З перадавіцы Правды).

«Правда» ў перадавіцы „Раскол у імя міру з капіталістамі" піша:

Мінула толькі некалькі месяцаў з таго часу, як Камуністычны Інтэрнацыянал даў свой прагноз аб напрамку эвалюцыі брытанскага рэфармізму, і мы ўжо бачым пацьверджаньне гэтага прагнозу. Ідэя „індустрыяльнага міру" пераходзіць в прапаганды ў практычнае ажыцьцяўленьне. Практыка „індустрыяльнага міру" азначае рэпрэсіі проці камуністаў і проці ўсіх тых рабочых, якія ня верацъ у клясавае супрацоўніцтва. Чарговыя гадовыя канфэрэнцыі 9 буйных саюзаў ухвалілі рэзалюцыі, у якіх „асуджваюць руйнуючую дзейнасьць камуністычнае партыі і руху меншасьці ў прафэсыянальным руху". Гэтае „асуджваньне" азначае пазбаўленьне камуністаў права займаць выбарчыя пасады ў розных арганізацыях трэд'юніёнаў. Яно, бясспрэчна, азначае ў бліжэйшым будучым індывідуальнае выключэньне камуністаў і левых рабочых з трэд'юніёнаў.

У свой час паведамлялася аб барацьбе, якая адбывалася ў шатландзкім саюзе горнякоў, дзе новаабраныя рабочымі кіраўнікі не дапушчаюцца займаць свае пасады. Зараз гэтая барацьба дасягнула кульмінацыйнага пункту. Наступны факт—раскол фэдэрацыі гарнякоў Шатляндыі, які будзе азначаць раскол фэдэрацыі горнарабочых Вялікабрытаніі. І цалком магчыма, што гэты раскол будзе першым крокам да цэлага шэрагу расколаў у прафэсыянальным руху Вялікабрытаніі.

Барацьбіты брытанскага рэфармізму ведаюць, куды трымаць напрамак. Нямецкі рэфармізм ужо адыграў ролю станоўчага фактара ў капіталістычнай рацыяналізацыі. На гэты шлях становіцца і брытанскі рэфармізм.

Брытанскія рэфармісты шчыльна падводзяць трэд'юніёны да расколу. Яны ня спыняюцца перад выкіданьнем рабочых мас з прафсаюзаў у імя „міру з капіталістамі".

БАНКНОТЫ Ў 2 ЧЫРВОНЦЫ.

МАСКВА, 12-VI. У пастанове Савету Народных Камісараў ад 11-га кастрычніка 1922 году наконт банкавых білетаў было прадугледжана, што банкавыя білеты выпушчаюцца таксама і -хчырвоннае вартасьці. Аднак, патрэбна было шмат часу, каб распачаць выпуск гэтае купюры, бо гэта зьявілася мераю, трохі новаю, паколькі ні крэдытныя білеты старога дзяржаўнага банку, ні казначэйскія білеты ў такой купюры не выпушчаліся.

Банкноты, якія будуць выпушчаны 15-га чэрвеня, падобны да банкнотаў аднарчырвоннае вартасьці ўзору 1926 году, бо яны таксама маюць каляровую пячаць. Надпісы на гэтых банкнотах зроблены ўжо не на адной мове, а на тасьці мовах саюзных рэспублік.

СКІДКІ С.-Г. ПАДАТКУ ДЛЯ РАЙЁНАЎ З НЕДАРОДАМ.

МАСКВА, 12-VI. Каб палегчыць становішча сялянскага жыцьця раёнаў, у якіх дрэнна ўрадзіла азіміна, саюзны СНК даў Наркамфіну СССР дырэктыву ўстанавіць скідкі з сельска-гаспадарчага падатку для пацярпеўшых сялянскіх гаспадарак у гэтых раёнах. Агульная сума скідак з сельска-гаспадарчага падатку па гэтых раёнах вызначана арыентыравана ў 8 мілёнаў рублёў. СНК УССР прапануецца апавясьціць мясцовыя пацярпеўшых раёнаў аб скідцы з нармальнага падатку.

Прызначыць патрэбным даць скідку з с.-г. падатку таксама і пацярпеўшым сялянскім гаспадаркам у раёнах Паўночнага Каўказу, саюзны СНК деручыў Наркамфіну СССР пагодзіць з эканамічнай нарадай РСФСР пытаньне аб разьмеры скідкі.

ПРАЦЭС ГРУПЫ ПРАВАКАТАРАЎ.

ЗАПАРОЖЖА, 12-VI. У акруговым судзе пачынаецца працэс групы анархістаў і правакатараў, якія перадалі ў рукі паліцыі ў 1906 годзе шэраг удзельнікаў рэвалюцыйнага паўстаньня ў Аляксандраўску. На лаўцы падсудных 8 чалавек. У выніку працэсу гэтых правакатараў, у 1906 годзе выязная сэсія адэскага вайсковага акруговага суду засудзіла ў Кацярынаслаўлі 120 удзельнікаў аляксандраўскіх рэвалюцыйных падзей.

На працэс выклікаецца 40 навочных сьведак, удзельнікаў рэвалюцыйных падзей.

РАЗГУЛ ПАЛІЦЭЙСКА-ПЭПЭЭСАЎСКАГА СВАВОЛЬСТВА.

Выкрытыя ў сойме гвалты паліцыі.

ВАРШАВА, 12-6. Пры абмеркаваньні бюджэту міністэрства юстыцыі эндэк Трамбчынскі зрабіў вялікую прамову, дзе апісваў на гвалтах, якія чыніць паліцыя. У прыватнасьці Трамбчынскі паведаміў падрабязнасьці зьбойства журналіста Масевіча, які быў заведзены паліцэйскімі за горад. Удзельнікаў зьбойства Трамбчынскі назваў па прозьвішчах.

Выкрытае Трамбчынскім зрабіла вялікае ўражаньне, але ён ня мог скончыць, бо прамова была абарвана.

Наскок ППС-баядытаў на рабочую ваколіцу.

ВАРШАВА, 12-6. Камуністычная фракцыя сойму атрымала ад рабочых, якія жывуць у Брудно (ваколіца Варшавы) ліст, дзе паведамляецца, што 2 чэрвеня пэпэсаўскія дружыньнікі, прыехаўшы на 4-х грузавіках, зьбівалі ў ваколіцы рабочых, западозраных у камуністычнай дзейнасьці. Дружыньнікі страляді ў рабочых з рэвальвэраў і паранілі 16 чалавек. Адзін з параненых у безнадзейным становішчы. Дружыньнікамі кіраваў забойца камуніста Балагоа, Кавальскі. Ніхто з дружыньнікаў да адказнасьці ня прыцягнут, і газэты пра гэты выпадак маўчалі.

10 чэрвеня дружыньнікі яшчэ раз учынілі наскок на гэтую ваколіцу.

ПОЛЬШЧА ЎЗМОЦНЕНА МІЛІТАРЫЗУЕЦЦА.

Вайсковыя выдаткі складаюць 40 проц. бюджэту—ППС цалком падтрымлівае фашызм.

ВАРШАВА, 12-VI. Сойм ухваліў бюджэт вайсковага міністэрства. Бюджэт запьверджан у суме 760 мілёнаў злотых, што складае 40 процантаў усіх выдаткаў.

Выступаўшы пэпэсавец Лідэрман заявяе, што ППС займае ў адносінах бюджэту дзедавую пазіцыю, бо міжнароднае становішча не гарантуе захаваньня спакою як для іншых дзяржаў, так і для Польшчы. «У Эўропе—заявіў Лідэрман—ёсьць крыніцы, якія прымушаюць пенакоіцца за спакой: афіцэры, што засталіся пасьля Гогенцолернаў і мараць аб фашысцкай дыктатуры ў некаторых эўрапейскіх краінах і наравце вялізарны рост мілітарызму ў СССР. Саветы ўвялі міліцыю, але маюць адначасна і сталую армію. Вайсковая і хэмічная прамысловасьць у СССР надзвычайна пашырылася. Для насельніцтва выдаецца 20 вялікіх вайсковых газэт. Штогод адбываецца навучаньне 600 тысяч членаў народнае міліцыі. У 1935 годзе саветы будуць мець 10 мілёнаў людзей, навучаных вайсковай справе».

Выступаўшыя пасьля гэтага прадстаўнікі беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам адхілялі якія-небудзь ваенныя намеры ўраду і Пілсудзкага. Дэпутат беспартыйнага блёку Пэрацы заявіў, што польскі вайсковы бюджэт зьяўляецца «ўзорным бюджэтам, пабудаваным на мірных тэндэнцыях».

Пілсудзкі вярнуўся да працы.

ВАРШАВА, 13-VI. Газэты зьмяшчаюць афіцыйнае паведамленьне, што Пілсудзкі распачаў выконваць абавязкі прэм'ера. Пілсудзкі быў прыняты прэзыдэнтам рэспублікі, пасьля чаго накіраваўся ў прэзыдыум рады міністраў, дзе меў гутарку з віцэ-прэзыдэнтам Бартэлем.

Літва не адмовіцца ад Вільні.

БЭРЛІН, 9-6. Газэта «Берлінэр Бэрген Цайтунг» агалашае гутарку Вальдэмараса з жэнэўскім карэспандэнтам газэты аб выніках абмеркаваньня польска-літоўскага пытаньня на сэсіі рады Лігі Нацый. Водлуг слоў Вальдэмараса, нявыгоднае становішча, якое стварылася для Літвы ў Жэневе, не зьявілася неспадзяванкаю.

Што датычыць абвяшчэньня Вільні сталіцаю Літвы, дык Вальдэмарас заначыў, што такі акт гістарычна абгрунтаваны. Польшча праднамерана высунула гэтае пытаньне зараз для таго, каб зрабіць больш цяжкім надворна палітычнае становішча Літвы.

«Літва,—казаў далей Вальдэмарас,—не адмовіцца ні ў якім выпадку ад свайго бясспрэчнага права на Вільню». ЦЯЖКА СПАДЗЯВАЦЦА НА ПРАЦЭС ПЕРАМОЎ.

На запытаньне, ці можна чакаць, што на чарговай сэсіі рады Лігі Нацый перамовы з палякамі пасунуцца наперад, Вальдэмарас адказаў: «Гэта залежыць не ад нас, а ад палякаў. Наша пазіцыя выразная. Вільня ня ў нас, а ў палякаў. Паколькі, як відаць з нядаўніх паведамленьняў друку, для палякаў віленскага пытаньня ня існуе, дык цяжка спадзявацца на прагрэс у ходзе перамоў. Устаноўлены парадак працы камісіі застаецца няўхільным. Што-ж датычыць пісьмарнага пасяджэньня канфэрэнцыі, дык літоўцы прапануюць Польшчы сабрацца ў жніўні ў Кёнігсбэрге. Польшча адказу яшчэ не дала».

Нямецкія меншавікі складаюць урад.

БЭРЛІН, 12-VI. Прэзыдэнт Гіндэнбург меў спатканьне з рэйхсканцлерам Марксам, які падаў яму заяву аб адстаўцы яго габінэту.

Гіндэнбург даручыў арганізацыю новага габінэту лідэру сацыял-дэмакратычнае партыі дэпутату Мюлеру. Сацыял-дэмакратычная фракцыя рэйхстагу прызнала, што Мюлер павінен згадзіцца на даручэньне сфармаваць новы габінэт.

Пасьля абмеркаваньня пытаньня аб новым габінэце, у сацыял-дэмакратычнай фракцыі рэйхстагу адбыліся выбары бюро фракцыі. Бюро пераабрана ў ранейшым складзе. У бюро ўваходзяць: Мюлер, Гітман, Шэйдэман, Брэйдшэйт, Крысьпін, Гільфэрдынг (усяго 15 чалавек).

За рабочы блёк для барацьбы проці каліцыі.

БЭРЛІН, 12-6. У зьвязку з надыходзячым адчыненьнем рэйхстагу, ЦК нямецкае кампартыі агаласіў адозву да ўсіх працоўных, у тым ліку і да сацыял-дэмакратычных рабочых. Адозва заклікае ўсіх працоўных распачаць барацьбу пад лёзунгам—«Каляса проці клясы»,—і заснаваць блёк усіх працоўных, каб скінуць каліцыйны ўрад і ажыцьцявіць усе неадкладныя патрабаваньні пралетарыяту.

Нямецкія рэфармісты ўсё больш наглеюць.

БЭРЛІН, 11-6. У рэфармісцкіх прафсаюзах Нямеччыны робіцца ўсё больш частымі выпадкі звальненьня з пасады рабочых, якія падтрымліваюць левую прафсаюзную меншасьць. Рэжым тэрору выклікаў моцны рух пратэсту сярод рабочых. На шэрагу прадпрыемстваў адбыліся шматлюдныя сходы, якія выказваліся проці палітыкі выключэньня прыхільнікаў левае прафсаюзнае меншасьці.

Гэтымі днямі адбыўся дэлегацкі сход арганізацыі прафсаюзу дрэваапрацоўчыкаў у райёне Бэрлін-Ото, які таксама выказаўся проці выключэньня Г'іка і іншых з саюзу.

ШЫРОКАЕ ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ГРЭЦКІХ РАБОЧЫХ.

ВЕНА, 12-VI. Як паведамляюць з Атэн, 20 тысяч рабочых тытунёвых фабрык у шэрагу гарадоў Грэцыі абвясьцілі забастоўку. Водлуг слоў грэцкіх газэт, чакаюць, што да забастоўкі далучыцца 40 тысяч рабочых у Салоніках. Учора ў Гаване і Праві адбываліся дэманстрацыі бастуючых, якія былі разагнаны жандармэрыяй. Два жандары і адзін рабочы паранены.

Водлуг вестак, пакуль што не пацьверджаных, у Гаване і Праві быццам адбыліся крывавыя стычкі бастуючых з паліцыяй, у часе якіх некалькі чалавек забіта і 15 паранена. Паліцыя арыштавала 50 бастуючых.

Справа шахцінскіх контр-рэвалюцыянэраў.

ВЫЯЎЛЕНЫ ПАДРАБЯЗНАСЬЦІ ПОДКУПУ ЧЛЕНАЎ ШКОДНІЦКАЕ АРГАНІЗАЦЫІ НЯМЕЦКАЙ ФІРМАЮ КНАППА ЗА ПРЫЁМКУ НЯГОДНЫХ МАШЫН.

Паказаньні нямецкага мэханіка Бадштыбера.

Шкоднікі былі наймітамі Кнаппа.

МАСКВА, 12-VI. Раніцняе пасяджэньне шахцінскага працэсу 12-га чэрвеня скончылася паказаньнямі падсуднага Бадштыбера (канцёр нямецкае фірмы), раней адкладзенымі в прычыны хваробы абаронцы Бадштыбера.

— Калі я прыехаў на Ўласаўскі рудзік,—паказвае Бадштыбер, — дык мне паказалі машыну і пласт, на якім яна павінна была працаваць. Я зазначыў, што машына не гадзіцца. З Уласаўскі Бадштыбер пераехаў на капальню Вароўскага, дзе ён сустрэўся з Гаўрушэнкам і Нікіціным (падсудныя). Калі разам з імі Бадштыбер накіраваўся на капальні, дык і тут выявілася, што машына вельмі кепская. Аб гэтым ён заявіў інжынэру Зэебольду—прадстаўніку нямецкае фірмы. Водлуг слоў Бадштыбера, Нікіцін і Гаўрушэнка бачылі ўсе недахопы машыны і добра іх разумелі. Не зважаючы на гэта, яны рабілі ўсё, каб хутчэй накіраваць машыну ў капальню.

Потым Бадштыбер паказвае, што аднойчы Зэебольд перадаў Бадштыберу два канвэрты, адзін для Гаўрушэнкі, другі—для Нікіціна Зэебольд перадаў Бадштыберу, каб той папрасіў Нікіціна не рабіць ніяких перашкод пры прыёмцы машыны. Перадаючы грошы Нікіціну, Бадштыбер не сказаў яму дакладна таго, што яму гаварыў Зэебольд, але казаў што гэтыя грошы ад фірмы за працу па ўстаноўцы машыны...

Сам Бадштыбер „не жадаў браць удзелу".

Далей Бадштыбер апавядае, што на Бутоўку раз прыехаў Зэебольд, каб сабраць параўнаўчыя даныя аб прадукцыйнасьці машын Кнаппа і каб як-небудзь «абараніць машыны» Кнаппа. Бадштыбер, водлуг яго слоў, заявіў Зэебольду, што ён у гэтай справе не жадае браць удзелу, што ён у гэтым бачыць сьвядомае шкодніцтва. Зэебольд нічога не адказаў і выехаў. Пасьля гэтага быў складзен камісіяй акт аб машыне. Дакладнага зьместу акту Бадштыбер ня памятае, але ведае што гэта быў акт аб нягоднасьці машыны. Бадштыбер гэты акт падпісаў.

Потым Бадштыбера выклікалі ў Сталіна да інжынэра Кестлера. Кестлер—прадстаўнік нямецкае фірмы—выказаў Бадштыбера, што той падпісаў акт аб нягоднасьці машыны і заявіў, што гэта нелёйяльна ў адносінах да Нямеччыны, нелёйяльна ў адносінах да фірмы. Пры гэтым Кестлер дадаў: „Трэба было-б адразу на месцы камусьці сунуць у рукі некалькі сот руб. і ўсё было-б добра». І яшчэ дадаў: «Ну што-ж, калі я інжынэру Кузьме дам 2 з пал. тысячы, дык усё будзе ізноў упарадку».

Тысячы і пасылкі для Гарлецкага.

МАСКВА, 12-VI. На вячэрнім пасяджэньні шахцінскага працэсу даваў паказаньні падсудны Бадштыбер. Ён, між іншым, паведаміў аб тым, як у Сталіне ён выпадкова пачуў гутарку між Дэтэрам і Зэебольдам. Дэтэр быў п'яны і гаварыў, што трэба паскорыць здачу машыны дзеля таго, каб не перашкаджалі расейцы. Пачуўшы гэта, я вельмі спалохаўся, але зрабіць нічога ня мог. Калі Бадштыбер застаўся з Дэтэрам удваіх, дык Дэтэр пачаў яго лаяць і казаў, што з-за яго Бадштыбера, яму прышлося запляціць старшыні камісіі 2500 руб. Бадштыбер заявяе, што прозьвішча Кузьмы ён памятае вельмі добра і зусім яго ня блытае. Аб 2.500 руб. яму потым у Харкаве сказаў Зэебольд.

Хутка пасьля гэтага Бадштыбер вярнуўся ў Нямеччыну, але пражыў там нядоўга. Фірма не магла дараваць яму яго «памылак», і яго ў працягу доўгага часу трымалі ў „чорным целе". Потым яго ізноў накіравалі ў Расею для ўстаноўкі машыны ў Максеўцы.

Перад аўдэнцам у Расею Зэебольд выклікаў яго да сябе і перадаў 10 маленькіх календароў, у якіх аднак ніякіх фальшывых запісаў ня было. Даў ён яму яшчэ і дзьве пасылкі для Гарлецкага. У гэтых пасылках былі парфумы, панчохі, шкарпэткі, насаткі і інш. З 10 календароў 8 штук у яго на граніцы забралі, а рэчы дазволілі правесьці, у тым ліку і грамафон, які ён вёз для Зэебольда.

На запытаньні дзяржаўнага абвініцеля Бадштыбер адказвае, што на Ўласаўцы ён устанавіў адну машыну, яная аказалася для Веляхоўскага пласта вельмі кепскаю. Машына была звычайнага тыпу ўласаўскіх рубовых машын, аб нягоднасьці якое Бадштыбер ужо казаў і раней. На капальні Вароўскага ён устанавіў дзьве машыны, з якіх адна была годнаю, але з вельмі слабою прадукцыйнасьцю, другая магла працаваць толькі па скалкавай пародзе.

— Ці не наконт гэтых машын і былі ў вас перамовы з Зэебольдам і былі дадзены грошы?—пытае т. Крыленка.

— Але, наконт гэтых машын,—адказвае Бадштыбер.

Далей на запытаньні Бадштыбер адказвае, што ён атрымаў два пакоты ад Зэебольда. У адным было 300 руб., а ў другім —400 руб. Водлуг слоў Бадштыбера, адзін з гэтых пакетаў з трыма стамі руб. ён перадаў Гаўрушэнку, а другі—Нікіціну.

Выклікаецца Нікіцін, які пацьвярджае, што ён сапраўды атрымаў 400 руб., якія належалі яму «за эвыштэрміновую працу ад фірмы Кнаппа».

Кнапаўскія інжынэры за шкодніцтвам.

Па запытаньне т. Крыленка, які жадаў выявіць сэнс сказу Дэтэра ў гутарцы з Зэебольдам, Бадштыбер перадае яе ў трохі іншай варыянцы.—Трэба паскорыць прыёмку машын для таго, сказаў ён, каб расейцы не дагадаліся, што мы хочам шкодзіць. У гэтай гутарцы яны спаміналі таксама імя Кузьмы, які, як відаць, быў іх галоўнай апорай. Такую гутарку ў капальні вёў Зэебольд, і гэта Зэебольд сказаў, што «расейцы не заўважваюць нашае шкодніцкае працы».

Далей Бадштыбер ізноў апавядае аб тым, як Гаўрушэнка і Нікіцін пераканвалі яго падпісаць акт аб годнасьці нягоднае машыны, і аб тым, што на начостцы ў Гаўрушэнка в удзелам Зэебольда лаялі савецкую ўладу і сьмяяліся над рабочымі. Машыны, якія пастаўляла фірма, былі зроблены з кепскага матар'ялу—з браку і старога жалезо. У адной з гэтых машын была дзюрка, запханая акуркам, зьверху замазаная.

— А ці ня памятаеце вы, хто яшчэ быў у складзе камісіі?—пытае т. Крыленка ў Бадштыбера.

— А вось той абвінавачаны, што сядзіць побач з Кузьмою,—адказвае Бадштыбер.

— Аўчараў? Што скажа на гэта Аўчараў—пытае яго абвініцель.

— Ніякае камісіі я ня ведаю,—адказвае Аўчараў з месца.

Бадштыберу перакладаюць адказ Аўчарава.

— Што-ж я магу зрабіць,—гаворыць Бадштыбер,—я яго бачу, а калі ён адхіляе, дык аб чым-жа яго больш пытаць?

Падагульваючы ўчынкі Дэтэра і Зэебольда з аднаго боку і Гаўрушэнкі і іншых шкоднікаў—з другога, т. Крыленка пытае ў Бадштыбера:

— Ці ня відаць адсюль, што ў тых і ў іншых былі адпаўкавыя адносіны да савецкага рэжыму і адпаўкавае жаданьне пашкодзіць яму?

— Але—адказвае Бадштыбер,—яны мелі агульныя мэты. Іх мэты былі агульныя.

Бадштыбер заявяе, што ён ніколі ня меў злога намеру і, перадаючы грошы, нічога кепскага ня думаў. Дагадаўся аб мэце толькі пазьней.

— Такім чынам вы, значыць, пашкодзілі савецкай гаспадарцы?

— Але—згаджаецца Бадштыбер і дадае, што, зразумеўшы потым, што яго праца шкодніцкая, ён спалохаўся, але паведаміць аб гэтым не адважыўся. Паведаміць расейцам, значыць, пазбавіць сябе магчымасьці вярнуцца ў Нямеччыну.

У зьвязку з паказаньнямі Бадштыбера, суд апытвае шэраг падсудных. Усе яны пацьвярджаюць перад судом вельмі важныя факты, якія ўстанавляюць з бязумоўнасьцю сувязь між шкодніцкай арганізацыяй, як гэтакаю і прадстаўнікамі фірмы Кнаппа. На запытаньне т. Рагінскага падсудны Казарынаў, між іншым, паказвае, што ўвосені 26 г. у Заркаве быў галоўны інжынэр фірмы Кнаппа Гэстэр, які прывёз для арганізацыі 8 тысяч руб. Гэтыя грошы былі прысланы праз Гестэра братам падсуднага Башкіна, які знаходзіўся на службе ў АЭГ у Берліне. Разам з грашыма Гестэр прывёз ліст з Берліну ад Башкіна.

Апытаны падсудны Кузьма паказаў, што ён сустракаў Гестэра на Ўласаўцы. У гэты час Кузьма выбіраўся заграніцу і ўмовіўся з Гестэрам там спаткацца. Гестэр даў Кузьме адрас, як яго знайсьці заграніцаю.

Падсудны Нікіцін пасьля доўгіх ухільных адказаў пацьвярджае паказаньні Бадштыбера, што між Нікіціным, Гаўрушэнкаю і Бадштыберам адбывалася гутарка на тэму аб неабходнасьці складаць акты аб годнасьці машын для працы.

Ухвала суда.

Пасьля допыту падсуднага Бадштыбера, суд зваляе наступную пастанову: „З прычыны зробленых у працягу судовага сьледзтва шэрагам падсудных, а ўласна—Бадштыберам, Казарынавым, Нікіціным і Башкіным—паказаньняў аб злачынных учынках Зэебольда і Гестэра, спэцыяльная прысутнасьць ухваляе: кіруючыся арт. 315 Крымінальнага Працэсуальнага Кодэксу, даручыць пракуратуры ўстанавіць месца пабыту азначаных асоб і, у выпадку, калі яны знаходзя

У ПОЛЬСКІХ ТУРМАХ.

На акраіне польскіх гарадоў цягнуцца хмурныя нізкія будынкі з высокай агародай, каля якіх стаіць варта, і выдзяляюцца сярод бедных хат гарадзкой беднаты. У гэтыя будынкі трапляюць толькі абранцы, толькі тыя, хто звярнуў на сябе ўвагу польскай охранкі.

Ёсьць такі будынак і ў Беластоку, і з яго моцна закратаных вокнаў увачары, калі змрок зьнізіцца над горадам, вецер даносіць песьні да вуха рэдка праходзячага тут чалавека.

Мабыць гэтыя песьні пяюць маладыя дзяўчаты, палітзьняволеныя, члены камсамолу, якія зьбіраюцца каля моцных кратаў вакна сваёй камеры. Гэта песьні пра камсамол і пра СССР. Гэтыя песьні, прысьвечаны сьвяту камсамолу. Тут іх шмат, некалькі тузінаў сядзіць у гэтай турме.

І сярод іх Вера Харунжая. Яна працавала на фабрыцы і хадзіць у школу ёй ня прышлося. Але жыцьцё прымусіла яе быць сьведкай найгідкейшых зьявішчаў, якія могуць быць толькі пры загніўшым капіталістычным ладзе, ёй прышлося мець дачыненьне з белагвардзейскімі адкідамі. Вера бачыла п'яныя банды Булак-Балаховіча, якія рабавалі, гвалцілі, гранілі гарады і мястэчкі Беларусі. Яна чула стогны рабочых і сялян, якіх катаў бот польскага легіянэра. Усё гэта запаліла ў ёй той агонь, які і сёньня ў ёй ня толькі ня гасьне, але гарыць магутным полымем і робіць з Веры надзвычайнага рэвалюцыянэра-барацьбіта.

Раней, чымся пайсьці на барацьбу з панамі, Вера набыла грунтоўныя веды. Яна хадзіла ў школу, дзе вывучалі Маркса, Леніна, Плеханава і давалі рэвалюцыянэрам неабходныя веды.

Але і за кнігамі яе ніколі не пакідала думка аб рэвалюцыйнай працы, —думка, якую можна выказаць адным кароткім словам: „хутчэй". Хутчэй скончыць школу. Хутчэй падрыхтаваць усё неабходнае. Хутчэй узяцца за справу і стварыць нешта вялікае.

Вера перамагла ўсе перашкоды, некаторыя з іх будуць здавацца можа смешнымі, але яны маюць вялікае значэньне ў канспірацыйных адносінах. Вера насіла кароткія валасы. Гэта звычайнае зьявішча для нашых камсамолак магло яе выдаць і сарваць усю працу. Наогул усе манеры Веры не адпавядалі тэй ролі, якую яна хацела адыгрываць, працуючы нелегальна, ролі дзяўчыны з «высокапрызваітай» сям'і. Уся Вера была поўным увасабленьнем «буры і націску» камсамолу.

І вось узімку 1924 году Вера найшла, нарэшце, на нелегальную працу. Буйныя арганізацыйныя здольнасьці высунулі яе хутка ў першыя шэрагі арганізацыі. Яна працавала не пакладаючы рук і з нястомнай энэргіяй. Охранка ўжо ведала пра Веру і шукала яе, але яе цяжка было знайсьці.

„Ня гледзячы на сілу польскіх паноў і наперакор бясьсільнаму гневу, мы расьцём, мацнеем і ствараем магутныя арганізацыі",—пісала Вера. «Мы ахапляем у шырыню і ў глыбіню масы рабочай і сялянскай моладзі. Мы пушчаем усё новыя і новыя карэньні і распаўсюджваем нашы ідэі на заводах, фабрыках і па вёсках»!.

Цяжка, ма'быць, падпольная праца пад уладаю паноў, а на гэтую тэму пісалася ўжо нераз, але ніколі ня ўдасца вычарпаць усіх яскравых прыкладаў гэраізму і самаахвярнасьці, якія выяўляюць падпольшчыкі.

«Самым небясьпечным, самым лютым нашым ворагам зьяўляецца, уласна кажучы, польская охранка. Гэты вораг мае столькі асоб, столькі вачэй, вушэй, рук і ног, што часта ён вельмі шкодзіць нашай працы. Чым больш разгортваецца наша праца, тым больш зьмяншаюцца нават тыя нязначныя легальныя магчымасьці, якія да гэтага часу мы ўсё-ж мелі. І мы прымушаны ўсё-глыбей і глыбей забірацца ў падпольле. Усё часьцей і часьцей вам прыходзіцца скарыстоўваць нашы лістоўкі. Тут ужо цензура бясьсільна. Амаль кожны тыдзень мы заляпляем буквальна ўсе казармы, усе сьцены гораду і вёскі.

Ахапляе вельмі прыемнае пачуцьцё, калі бачыш на другі дзень раніцою, як цэлая зграя паліцэйскіх імчыць па ўсяму гораду, змывае, зьдзірае нашы моцна налепленыя белыя лістоўкі, або замазвае іх фарбай. А колькі лістовак ужо трапілі ў кішэні рабочых, вышаўшых рана на працу»!..

«Шматгаловая і шматвачовая» охранка доўга шукала Веру. Охранка падпільноўвала кожную магчымасьць, каб пакончыць з ёй.

Вера нібы гэта адчувала і пісала:

„Жыцьцё нашае бурнае і радаснае, як ніколі. Па перажываемых падзеях і па зьместу кожны з нашых дзён трэба лічыць за месяц, кожны месяц за год".

Але ў верасьні 1925 г. прышлося кепска і Веры. Яе захапіла хваля арыштаў, якая пракацілася ўвосені 1925 г. па ўсёй З. Беларусі. Вера не магла ўжо ісьці больш туды, куды хацела; ёй прышлося ісьці туды, куды захацелі засадзіць яе агенты охранкі: у астрог. Але і тут за парканам штыкоў Вера захоўвала бадзёрасьць духу і ўсьмех маладосьці.

«Астрог—глупства»,—піша яна ў адным з лістоў,—«астрог вусім не дасягае сваёй мэты, наадварот, ён творыць цуды ў сэнсе ўмацаваньня ў нас нашае ідэі».

«Я сябе адчуваю добра, вельмі добра»,—піша яна ў другім лісьце. «Я ня ведаю, што значыць сум, але затое я дасканала ведаю, што значыць радасьць і гнеў. Іншы раз скрыгачу зубамі, але гэта-ж няўхільна, цешуся я ўсё-ж часьцей. Мары і думкі аб будучыне так дасканалы».

Так піша чалавек, прасядзеўшы амаль тры гады ў астразе. На рахунку Веры напісана: «6 гадоў па старому працэсу», Беластоцкі працэс, які нідаўна адбыўся, дадаў да гэтых 6 гадоў яшчэ 8 гадоў астрогу.

І ўсё-ж яна мае моцны жартаваць.

«Калі-б вы ведалі, як мне хацелася-б паглядзець на вас хоць адным вочкам, але прыдзе дзень, калі мы ўсе зноў акажамся разам, і пры думцы аб гэтым дню я зьяжу ад радасьці, але мяне трохі палохае адна думка, вы тады будзеце ўсе з вусамі і бародамі, вы будзеце старымі, а не маладымі камуністамі. Ах, які жах. Мне балюча, што я ня ўбачу вас зноў такімі маладымі, якімі вы жывіце ў маёй памяці і якімі я вас так кахаю, але гэта недарэчна, але мне гэта балюча. Ну, дык добра, пакажыцеся з бародамі і вусамі. Такім чынам я вас усё-ж такі ўбачу зноў".

У пахмурным і нізкім будынку, адным з тых, якія сустракаюцца на акраіне польскіх гарадоў з закратанымі вокнамі жыве шмат маладых дзяўчын, падобных на Веру. Некаторыя з іх вельмі блядыя, яны выйшлі з шавецкае майстэрні, другія—чырвоныя здаровыя, змагацца ім давялося нядоўга, пасьля першых жа крокаў на рэвалюцыйным шляху, яны трапілі ў астрог.

«Мілыя, дарагія —пішуць гэтыя дзяўчаты. —Мы ведаем вас ужо троха і гэта цешыць нас. Некаторых з вас нам удалося бачыць на фатаграфічных картках, гэта было вялікаю ўцехаю для нас. Шчырае, самае шчырае прывітаньне вам, маладым, творчым сілам нашае гвардыі. Жадаем вам посьпеху ў вашай працы, спадзяёмся, што вы заўсёды будзеце ісьці наперад. Будзьце моцны і бадзёры».

Ці сумуюць гэтыя дзяўчаты? —Не. Аб іх піша Вера сваёй сястрэ наступнае:

„Калі-б ты ведала, з якой нецярпліваасьцю мы ўсе 133 чакаем нашага працэсу. Мы прыдзем на яго не як пакорлівыя авечкі, мы ня будзем прасіць апраўданьня, мы горда і сьмела абвясьцім, што нас не запалохалі ні катаваньні, ні охранка, ні гады астрогу, што мы не баімся акту абвінавачаньня, што мы верны нашай барацьбе і верым у нашую перамогу".

Дасканалыя словы рэвалюцыянэраў. Успомнім аб іх сёньня ўвечары, калі паявяцца зоркі на небе і калі дзяўчаты засьпяваюць свае песьні. Успомнім тую гадзіну, калі сьвяткуючая польская рэакцыя ўхваліла катаржны прысуд Веры і іншым рэвалюцыянэрам.

С. КОНРАД.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

ВЯСЕНЬНЯЯ СЯЎБА СКОНЧАНА.

Беднякам, удовам, сем'ям чырвонаармейцаў КСУ дапамаглі засеяць загоны.

Старыя-Дарогі, 13-6. Скончылася вясеньняя пасяўная кампанія па раёне. Зараз кожна падагуліць вынікі тых мерапрыёмстваў, якія правёў Старадарожскі РКСУ ў часе вясеньняй пасяўной кампаніі.

Перад пачаткам вясеньняй пасяўной кампаніі быў склікан пашыраны пленум РКСУ з удзелам усіх старшынь вясковых камітэтаў узаемадапамогі і прадстаўнікоў ад сельска-гаспадарчай каапэрацыі, агранаміі і савецкай гаспадаркі Палажэвічы. На гэтым пленуме быў складзен план правядзеньня вясеньняй пасяўной кампаніі.

Усяго было загатоўлена 4591 пуд. розначага насеньня, якое было выдадзена 938 бядняцкім гаспадаркам і 25 бедным удовам. Апроч таго, было выдадзена 5 удовам на закупку насеньня 50 руб. і на закупку жывога і мёртвага інвэнтару 2 бядняцкім гаспадаркам 120 руб.

Да пачатку вясеньняй пасяўной кампаніі былі адрамантаваны ўсе машыны пракатных пунктаў і арганізаваны 3 новыя пракатныя пункты.

Усяго гэтымі пракатнымі пунктамі было ачышчана насеньня 4700 пуд.

У Шчыткаўскім вясковым камітэце ўзаемадапамогі праз увесь час вясеньняй кампаніі працавала кузьня, якой адрамантавана 155 плугоў сябром т-ва і некалькі плугоў адрамантавана бясплатна 3-м удовам і 2-м сем'ям чырвонаармейцаў.

За ўвесь час пасяўной кампаніі была аказана дапамога ў заворцы і пасеву палёў 5-ці сем'ям чырвонаармейцаў і 7-мі бедным удовам, якім апрацавана 17 дзес., а таксама абслужана машынамі пракатных пунктаў і іншым с.-г. інвэнтарам 10-ць гаспадарак—сем'яў чырвонаармейцаў і 180 бядняцкім гаспадаркам. Вялікая праца была праробленa камітэтамі ўзаемадапамогі ў справе арганізацыі калектыўнай дапамогі беднаце.

Так, была арганізавана адна дружына з камсамольцаў і рабочых савецкай гаспадаркі Палажэвічы, якімі апрацавана 19 з палавіны дзес. зямлі ў 14 бядняцкіх гаспадарках. І яшчэ адно дасятненьне трэба адзначыць: у час вясеньняй пасяўной кампаніі каапэравана 145 бядняцкіх гаспадарак і 20 гаспадарак бедных удоў.

НА ДАПАМОГУ ВЯСКОВАЙ ЖАНЧЫНЕ.

Сёлета будзе адчынена 280 палявых ясьляў.

Вядзецца шырокая падрыхтоўка да адчыненьня палявых ясьляў, якія наладжваюцца з 15 чэрвеня. Усяго сёлета на бюджэту Нар. Кам. Аховы Здароўя будзе адчынена ў акругах 213 палявых ясьляў, з іх 8 пры савецкіх гаспадарках. Апроч гэтага, шмат ясьляў сёлета будзе адчынена за кошт грамадзкіх і прафсаюзных арганізацый. Так, цэнтральнае праўленьне саюзу працаўнікоў зямлі і лесу адчыняе ў савецкіх гаспадарках 2 ясьляў, спажывецкая каапэрацыя 16 ясьляў, Белсельсаюз 8 ясьляў і Беларускае т-ва Чырвонага Крыжу адчыняе па адных ясьлях у кожнай акрузе.

Само насельніцтва адчыняе ясьлі пры дапамозе камітэтаў узаемадапамогі, шэфскіх т-ваў і Нар. Кам. Аховы Здароўя. Нар. Кам. Аховы Здароўя асыгнаваў на адчыненьне гэтых ясьляў у выгадзе дапамогі 700 руб.

Як дасятненьне ў сёлетнім годзе, трэба адзначыць, што некаторыя акругі разгарнулі значную працу па выяўленьні ініцыятывы мясцовага насельніцтва ў справе адчыненьня ясьляў. Так, Бабруйская акруга да сваіх 33 бюджэтных ясьляў дадаткова адчыняе за кошт грамадзкіх сродкаў яшчэ 21 палявыя ясьлі, у Менскай акрузе за кошт грамадзкіх сродкаў адчыняецца 28 ясьляў.

Усяго сёлета на сродкі Нар. Кам. Аховы Здароўя і грамадзкіх арганізацый мае быць адчынена 280 палявых ясьляў, што, у параўнаньні з мінулым годам, дае павялічэньне на 22 проц.

Пазыкі выдаюць не беднякам, а заможным.

Гомель, 13-6. Сельгасбанкам і Палессельсаюзам яшчэ ў сакавіку месяцы было раз'асынавана па крэдытных таварыствах каля 4 тыс. руб. на ўцягненьне беднаты ў спэцыяльныя вытворчыя віды сельгаскаапэрацыі. Крэдытныя таварыствы выкарысталі гэтыя сродкі не па прызначэньні, а ў асобных выпадках выдавалі пазыку заможным. Акрвыканком прапанаваў РВК прыняць меры да метазгоднага выкарыстоўваньня бядняцкага фонду па каапэраваньні.

Ліквідацыя гандлёвых прадстаўніцтваў.

Гомель, 13-6. Аддзяленьнем Белпайгандлю ўзьнята пытаньне аб ліквідацыі некаторых гандлёвых прадстаўніцтваў. Прыкладна: па генэральнаму ўгавору з Белхарчтрэстам—Белпайгандаль павінен рэалізаваць усю яго прадукцыю. Між тым у Гомелі мясцца аддзяленьне трэсту. Аддзяленьнем ужо падпісан угавор з Севкрайгандлем на рэалізацыю яго прадукцыі. Вядуцца перамовы з Махорасындыкатам. Ліквідацыя прадстаўніцтваў дасьць значную эканомію сродкаў.

Кватэрна-каапэрацыйнае будаўніцтва.

Гомель, 13-6. Кватэрна-каапэрацыйнае будаўніцтва разгортваецца. З посьпехам праходзіць праца па пабудове Дому Гарсавету, з тым, каб у лістападзе месяцы пачаць засяляць яго кватарантамі. Распачалі пабудову 2-х камяніц. Заканчваецца пабудова 2 камяніц і 1 драўлянага дому. На ўсёй працы занята каля 500 чалавек. Праўленьне дарог распачало пабудову для чыгуначнікаў. ДТПО будуе камяніцу пад краму. Дорпрафсож распачынае пабудову клюбу.

ВЫПУСК ЯЎРЭЙСКАГА ПЭДТЭХНІКУМУ.

Гомель, 13-6. У хуткім часе адбудзецца 3-ці выпуск яўрэйскага пэдагагічнага тэхнікуму. Усяго будзе выпушчана 36 настаўнікаў, з іх 2 партыйцы і 19 камсамольцаў. Выпушчаныя настаўнікі будуць накіраваны ў мястэчкі на працу.

МАШЫНЫ ДЛЯ САМАТУЖНІКАЎ.

Віцебск, 13-6. Беларускі „Орг"(т-ва рамесьніцкай працы сярод яўрэяў) атрымаў для Віцебскай пазычкова-ашчаднай касы 5 замежных машын для разьмеркаваньня паміж загатоўшчыкамі і 1 машыну для вырабу мярэжак.

Сельска-гаспадарчы падатак.

БЕДНАТА ВЫКРЫВАЕ ЎТОЕНЫЯ АБ'ЕКТЫ.

Ворша, 13-VI. У Аршанскай акрузе кампанія вучоту аб'ектаў ападаткаваньня пачалася своечасова. Зараз на акрузе праводзяцца і праведзены пашыраныя пленумы сельсаветаў з удзелам членаў с.-с., настаўнікаў, ізбачоў, актыву вёсак, беднаты і, наогул, усяго сялянства. Шырокія колы бядняцкага насельніцтва ўхваляюць новы падатковы закон. Кулакі і заможнікі з вялікай напружанасьцю сустракаюць новы закон. Ва ўсіх вёсках, дзе ўжо праведзены сходы, на якіх абгаварвалася гэта пытаньне, заможнікі і кулакі ўсімі сіламі імкнуліся захаваць, не выяўляць поўнасьцю зямлю і жывёлу.

Вось некалькі прыкладаў.

У Задняпроўі (г. Ворша) заможнікі хацелі захаваць больш 100 дзес. зямлі. Але, ня гледзячы на ўсе хітрыкі заможнікаў і кулакоў, бяднейшая частка рашуча паставіла пытаньне аб выяўленьні зямлі.

У в. Жукава, Коханаўскага райёну адзін з кулакоў, нехта Картавіцкі, да сёлетняга году ўказваў, што ў яго 10 дзес. ворнай зямлі і 7 дзес. сенажаці. Але ў гэтым годзе беднота рашыла вывіць, колькі кулак мае зямлі. Каморнік, абмерыўшы яго вучастак, знайшоў—15,5 дзес. ворнай зямлі і 4 дзес. сенажаці. За гэтае злачынства кулака аштрафавалі на 57 рублёў. У гэтай-жа вёсцы за ўтойваньне аштрафаваны яшчэ два заможныя гаспадары.

У Крупскім райёне выяўлены таксама два гаспадары, якія ўтойвалі 19 дзес. сенажаці. У мікулым гэтыя гаспадары плацілі 160 руб. падатку, а ў гэтым годзе яны будуць плаціць каля 800 руб.

У в. Бязводзічы Мсьціслаўскага райёну выкрыта 88 дзес. зямлі.

У в. Ратча Круглянскага райёну ў час вучоту аб'ектаў ападаткаваньня выяўлена 126 дзес. зямлі.

Апрача ўтойваньня зямлі і жывёлы маюцца і такія факты, як утойваньне незямляробчых прыбыткаў. У Багушэўскім райёне ў трох вёсках Дзевіна, Чуйкі, Іванава выкрыта неземляробчых прыбыткаў на 5789 руб.

Вось некалькі прыкладных фактаў барацьбы беднаты з кулакамі і заможнікамі за правільную палітыку партыі.

Беднота Аршанчыны і ў далейшым будзе весьці рашучую барацьбу за правільнае ажыцьцяўленьне падатковага закону.

„Калі хочаце, правярайце".

Магілеў, 12-6. Пачаў Машанацкі сельсавет (Лупалаўскага райёну) праводзіць вучот па сельгаспадатку з Брылёўскіх хутароў.

І налічыў: на 10 заможных двароў... 4 сьвіньні. Зразумела, што ўтоены і коні, і каровы, і авечкі.

Няхай сабе 4 сьвіньні. Якая да гэтага справа сельсавету? Ён сабе паслаў вучотны сьпісак у райвыканком: калі хочаце, правярайце...

З такімі сельсаветамі далёка не заедзеш. Калі утойшчыкаў трэба штрафаваць, дык тыя сельсаветы, якія дапамагаюць апошнім, трэба аддаваць пад суд.

Адзін з прыкладных.

Ворша. У Расьнянскі РВК 1-га чэрвеня зьявіўся селянін **Антон Лісіцкі** і зьвярнуўся ў грашовую частку, каб яму падлічылі сельгаспадатак на 1928-29 год. Падатак, вядомая рэч, быў вылічан зараз-жа на суму 63 руб.

Грамадзянін Лісіцкі доўга ня думаючы выняў з кішэні 40 руб. грошай і заплаціў падатак—кажучы: «Я прадаў жывёліну і, каб не патраціць абы на што грошы, рашыў унесьці падатак».

Быт і норавы Мазырскія.

Калі вы—новы чалавек у Мазыру, вам ёсьць тут чаму падзівіцца. Вы здзіўлены і захоплены прыгожымі высокімі гарамі, шырокім прасторам Прыпяці, бязьлікавай колькасьцю мазырскіх гасьцініц з самымі славутымі назвамі: «Англія», «Марсель», «Эўропа», «Лёндан», а яшчэ больш вас здзівіць быт і норавы Мазырскія.

Тут прадаецца «Зьвязда».

Вы беларус. Вы прывыклі чытаць беларускую газэту і, мімаволі, шукаеце вачыма будынку—кіёск, каб купіць «Зьвязду» або «Савецкую Беларусь». Урэшце вашаму воку ўдаецца прыкмеціць на адным з няпрыкметных пакойчыкаў надпіс «тут прадаецца «Зьвязда». Вы заходзіце ў пакой і коратка і проста заяўляеце:

— Дайце мне „Зьвязду".

— Зьвязду?!

— Але, „Зьвязду".

— Няма. Зьвязда не прадаецца. Яе можна толькі выпісаць.

Пра «Савецкую Беларусь» лепей ня пытайце. Беларускія газэты тут не прадаюцца. А шыльдачка аб продажы беларускіх газэт для чаго вісіць?

Мусіць для таго, каб людзі пыталіся.

Не забывайцеся, што вы ў Мазыры!

Калі вам хочацца есьці, вы абавязкова накіруйцеся ў кафэ-рэстаран Мазырскага ЦРК. Тут вы надпадаеце пад прыгнёт мазырскіх нораваў. Да 3 гадзін у Мазыры не абедаюць і рэстаран заляўляе—«абед пасьля трох».

Калі вы ўжо ўзялі квіток на права абеду, вашы мукі яшчэ ня скончаны. Вы павінны абавязкова прастаяць у чарзе каля крэсла поўгадзінкі і, сеўшы на крэсла, чакаць... Вы чакаеце... Бачыце, як носяцца, як учадзеўшыя па ўсяму „кафэ", два няшчасьнікі—афіцыянты, чуеце, як крычаць людзі „эй, сюды, сюды, таварыш"! А ў «таварыша» адзін адказ: «пачакайце—не разарвацца».

Вы чакаеце... Чакаеце поўгадзіны, гадзіну і калі вы пачынаеце гучна-галосна трэбаваць абед, перад вамі зьявіцца міліцыянэр з пагардай заяўляючы:

— Таварыш! Сядзіце, маўчыце і чакайце, не забывайцеся, што вы ў Мазыры, а то...

Што тут ужо «а то»... дагаварваць не бярусь. Напэўна нешта страшнае.

«Скверь закрыт».

У Мазыру ёсьць сквэр. Цераз нізкі відаць лавачкі, прыгожа рассаджаныя расьліны, але ў сквэр вы ня зможаце папасьці. З якіх бы вы дзьвярэй у яго ня ўздумалі зайсьці, усюды вас спыніць маленькая шыльдачка: „Скверь закрыт до"...

„Скверь" і ўзапраўды зачынен, а гэтым сьведчыць замок. Прыдзіце вы цераз гадзіну — зачынен «скверь», прыдзіце вечарам, раніцою, прыдзіце заўтра, праз тры дні, усё роўна «скверь закрыт до...» да бесканечнасьці.

«Гарадзкі сад».

Калі вас так няпрытульна сустрэў «скверь» сваім замком і шыльдачкаю, вы абавязкова накіруецеся ў мазырскі гарадзкі сад, спадзяючыся, што хоць ён не зачынен.

З патугамі вы лезеце па паламанай і размытай дажджом земляной лесьніцы на гару, спатыкаецеся, зноў лезеце і, урэшце, чытаеце выцьвілую шыльду «Пролетарскі сад Профінтэрн».

Але як толькі вы пераступілі вароты, вас кідае ў жах. Вы ніколі ня бачылі такога „гарадзкога саду". Ніводнае дарожкі-сьцежачкі, ламаючы, што ў лесе пасьля буры, абгарожы сьвеціць дзіркамі, сад перакопан слізкімі лычамі ўздоўж і ўпоперак. Брудняпругожасьць.

У летнім тэатру, што стаіць тут, лавы паламаны, бы пасьля пагрому...

Вы вопрамецьцю спушчаецеся з гары, уцякаеце ад брыдоты і няхайнасьці, што вы бачылі ў садзе.

Вы йдзеце ў свой нумар «Англіі», з гора падаеце на ложак і...

Стараецеся забыцца, выкінуць з галавы Мазыр, яго быт і норавы.

А. Дамброўскі.

Культуртэхніка.

158192 руб. на пашырэньне культуртэхнікі.

Культуртэхніка—тэрмін стары. Кожны ведае, што культуртэхніка—гэта пашырэньне плошчы зямлі з кармовымі травамі, культура балот, на якіх нішто не расло і, урэшце, паляпшэньне сенажаць.

Сяляне таксама ведаюць, што такое культуртэхніка. Грунтуючыся на гэтым, Менскі АЗА пабудаваў свой вытворчы плян па культуртэхніцы на 1927-28 г. АЗА упэўнен, і ён не памыляецца, што тут самадзейнасьць саміх сялян—вялікая справа. Плян пабудован з разьлікам на самадзейнасьць насельніцтва, арганізаванага ў мэліарацыйныя таварыствы.

Па культуртэхніцы на 1927-28 год вызначаны работы па Менскай акрузе на 168.192 руб. На пакрыцьцё гэтай сумы Белсельбанк пазычае толькі 54,627 руб., а рэшта—грошы самога насельніцтва.

Дзяржава не стаіць у баку гэтай важнай сялянскай справы. Дзяржава высначыла за свой кошт цэлы шэраг мерапрыёмстваў, якія дапамогуць сялянству. Вось яны:

Пракатныя пункты.

Каб даць насяленьню балотна-луговыя прылады на пракат і гэтым дапамагчы сялянам асушыць балоты, мяркуецца арганізаваць 5 пракатных пунктаў. На пунктах будуць плугі, бароны, 7 трактараў і інш.

Гэтых прыладаў для ўсіх мэліарацыйных таварыстваў замала. Па гэтай прычыне яны будуць разьмеркаваны паміж таварыствамі тых балотных масываў, дзе зроблена асушка балот. Гэткія таварыствы ёсьць у райёне рэк: Сьвіслачы, Плісы, Чарніцы, Вусы, Піцічы, Грэбелькі і інш.

Кошт інвэнтару, які будзе знаходзіцца ў пракатных пунктах, даходзіць да 13 тысяч рублёў.

Паказальныя вучасткі.

Паказальныя вучасткі па культуры балот будуць закладзены сёлета на 17 гэктарах балот.

На вучастках у паказальным парадку на мінэральных угнаеньнях будуць сеяцца розныя травы.

Апроч таго, на плошчы каля 9 гэктараў будуць закладзены гадавальнікі для насеньня кармовых траў.

Сёлета АЗА мяркуе арганізаваць

курсы для мэліаратараў,

на якіх атрымаюць спэцыяльную падрыхтоўку 60 чалавек. Курсы будуць існаваць у працягу месяца. Арганізацыя іх будзе каштаваць каля 3 тысяч руб.

Апрача таго, 6 культуртэхнікаў вызначана для правядзеньня ў мэліарацыйных таварыствах гутарак на спэцыяльныя тэмы.

У цэлым шэрагу балотных масываў будзе заснавана

55 новых мэліарацыйных таварыстваў.

Гэтыя т-вы ахопяць сабою 12.760 гэктараў балот, якія да гэтага часу ляжалі амаль без карысьці.

Дзяржава за свой кошт робіць для сялянскае справы яшчэ вось што:

Арганізуе экскурсіі сяброў таварыстваў у розныя паказальныя ўстановы; прэміруе за лепшую культуру балот адно таварыства прэміяй у 100 рублёў, а 2—прэміямі па 50 руб. кожнае; арганізуе зьезд сяброў мэліарацыйных таварыстваў; набывае неабходныя прылады для тэхнічнага пэрсаналу і г. д.

Такім чынам, дзяржава адпускае дапамогу сялянам на культуру балот 30.897 руб.

У многіх райёнах сяляне зразумелі карысьць культуртэхнікі. Гэтыя сяляне ўжо зрабіліся культурнымі гаспадарамі. Іх гаспадаркі, жывёла, пасевы ад гэтага таксама культурныя.

С. Азерскі.

ЕМ. ЯРАСЛАЎСКІ.

ЗБРОЯ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫІ.

(Аб антысэмітызьме).

Ня ўсе, можа быць, ведаюць, што азначае гэтае мудрае слова—антысэмітызм. Літаральна гэта значыць «проці яўрэйства». Гэтай хваробаю хварэюць ня толькі клясавыя ворагі пралетарыяту—антысэмітамі, ворагамі яўрэйства і яўрэяў зьяўляюцца нярэдка і працоўныя. Проці яўрэяў можна чуць розныя наветы і абвінавачаньні.

Антысэмітызм вядзе свой пачатак з дарэвалюцыйнага мінулага Расеі. У царскай Расеі яўрэі былі бясправным народам. Але гэтае бясправе не датычылася яўрэйскае буржуазеі. Яўрэйская буржуазея і пры царыкве жыла вальготна. Для яўрэяў-ж працоўных існавала гэтак званая «мяжа яўрэйскай аседласьці», г. зн. некалькі губэрняў у Паўночна-Заходнім краі і на Поўдні, за мяжу якіх ім не дазвалялася выяжджаць. Для яўрэйскае буржуазеі гэтыя законы не існавалі. Купец першае гільдыі—яўрэй мог жыць у Маскве, Пецярбурзе і ў іншых гарадох, ён мог быць ганаровым грамадзянінам. Капітал купецкі і банкірскі купляў і царскіх чыноўнікаў і царскі закон. Ён перарабляў гэта так, як гэта было патрэбна купцу. Яўрэйскі банкір, яўрэйскі купец разам з расейскім купцом, банкірам, абшарнікам, нямецкім, францускім, ангельскім—усё роўна якое нацыі—аднолькава эксплёатавалі, выціскалі пот, нажываліся на працы і на пакутах працоўных мас.

І нават праваслаўныя церквы будаваў яўрэй—уласьнік цукровага заводу Бродзкі ў Кіеве. Для высокаадукаванай інтэлігэнцыі таксама былі льготы. Дактары, інжынеры і інш. карысталіся правам паўсюднага пражываньня. Для яўрэяў быў забаронен доступ да дзяржаўных пасад. Закон царскі ўсім цяжарам быў накіраван проці яўрэйскае беднаты, проці яўрэйскіх працоўных мас. Яна была бясправная. Заціснутая ў мястэчках Паўночна-Заходняга краю, яна шукала ратунку ў розначага роду рамесьніцкіх майстэрнях, дробным гандлі, пасрэдніцтве, стварыўшы, такім чынам, вялізны непрадукцыйны слой насельніцтва, які сам, жывучы амаль у голадзе, разам з тым ня прыносіў ніякае карысьці.

Папы вякамі выхоўвалі масы ў байках аб тым, нібы яўрэі віноўнікі ў сьмерці Хрыста. Калі гнеў народу ўзьнімаўся проці цара, князёў, графоў, абшарнікаў, капіталістаў—гэтыя эксплёататары шукалі грамаадводу ў антысэмітызьме. Яны нацкоўвалі пры дапамозе папоўскіх пропаведзяў, пры дапамозе нагромных лісткоў масы працоўных рабочых і сялян проці яўрэяў. Арганізоўваліся яўрэйскія нагромы, лілася кроў, забіваліся сотні і тысячы базьвінных беднякоў, забіваліся дзеці, гвалціліся жанчыны. А багатых звычайна не чапалі. Іх баранела паліцыя, іх бараніў капітал.

Між іншым у царскай Расеі наладжваліся ня толькі яўрэйскія нагромы а наладжваліся нагромы проці армян, і проці татар, і проці грузін, і проці кіргізаў, наладжвалі сапраўдную разьню, вырэзвалі сотні і тысячы людзей. Гэта цкаваньне аднае нацыянальнасьці проці другой дапамагала часова ўраду ўхіляцца ад гневу працоўных—рабочых і сялян—і ратаваць галоўных віноўнікаў іх пакут—цара, капіталістаў і абшарнікаў.

Рэвалюцыя лютаўска-сакавікоўская 1917 году і асабліва Кастрычнікавая рэвалюцыя адразу зьнішчыла ўсе гэтыя непарадкі. У Савецкай дзяржаве няма месца нароўнапраўю нацыянальнасьцяй. Законы, якія абмяжоўвалі адну нацыянальнасьць і давалі выключныя, пераважныя правы другой, былі зьнішчаны. Савецкая дзяржава стала для ўсіх народаў вольнай краінай, у якой яны, на падставе братэрскага саюзу, супольна працуюць для ўзьняцьця агульнага дабрабыту працоўных, для будаўніцтва сацыялізму.

Аднак, яшчэ і цяпер так шмат недахопаў у нашай краіне, так шмат незабясьпечанасьці для цэлых груп працоўнага насельніцтва, што сямутаму ўдаецца выкарыстаць гэтыя цяжкасьці і гэтае незадаволеньне для таго, каб накіравець на фальшывы шлях працоўных. Нехта штодзень узмацняе вякамі выхаваную нянавісьць проці яўрэяў; нехта штодзень напэўтвае і расейцу, і украінцу, і беларусу: вось твой вораг, вось ён вінават у тым, што ёсьць беспрацоўныя; вось ён вінават у тым, што ёсьць патрэба ў кватэрах. Пры гэтым вораг ніколі не пакажа на сотні, тысячы яўрэйскае беднаты, якія амаль што галадуюць, а ён пакажа на нэпманаў, на яўрэйскую буржуазею.

Працоўнаму чалавеку трэба падыходзіць да гэтых абвінавачаньняў раней усяго з такога боку: няма добрага ці кепскага народу. Сярод кожнага народу ёсьць клясы, у кожным народзе ёсьць рабочая кляса. І рабочаму і работніцы трэба раней усяго глядзець не на колер валос, ці скуры, не на тое, які ў чалавека нос, не на тое, якія ў яго валасы, а трэба глядзець на тое, ці рабочы гэта чалавек, ці паразіт. Трэба паглядзець, ці буржуй гэта, ці нэпман, ці кулак, ці працоўны. Калі ён працоўны, дык вінаватасьць справы да таго, якой ён нацыянальнасьці. Калі мы на нашых сьцягах пішам: «Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся», дык мы маем на ўвазе ўласна гэта; рабочыя ўсіх краёў, працоўныя ўсяго сьвету павінны быць аб'яднаны ў адзін саюз для таго, каб зьнішчыць на ўсім сьвеце ўладу капіталістаў і абшарнікаў.

Кожны рабочы, кожная работніца, кожны селянін і кожная сялянка павінны падумаць, ці перашкаджае гатаму антысэмітызм. Нянавісьць проці яўрэйства, проці яўрэяў зацямняе клясавы сэнс барацьбы працоўных. Антысэмітызм падмяняе барацьбу клясавую, барацьбу працоўных проці эксплёататараў барацьбой адной нацыі проці другой. Антысэмітызм, такім чынам, паслабляе саюз працоўных, антысэмітызм разьмяжоўвае працоўных.

Мы ведаем, што гаворыць нашы ворагі: а ці-ж няверна, што яўрэяў рабочых мала, а найбольш—яўрэі нерабочыя. Зразумела, што яўрэяў рабочых яшчэ мала таму, што ў дарэвалюцыйнай Расеі ў працягу доўгага часу іх ня прымалі ні на заводы, ні на фабрыкі. Як мы ўжо казалі, яны займаліся рамесьніцтвам, гандлем, пасрэдніцтвам. У сучасны момант яўрэі складаюць усяго 2 проц. насельніцтва СССР, прычым гэта насельніцтва згуртавана, галоўным чынам, у гарадох. У гарадох яўрэі складаюць 10 проц., а на вёсцы: на 300 чалавек адзін яўрэй. Але ўжо зараз членаў прафсаюзаў яўрэяў масцца 340 тысяч чалавек, 150 з іх працуюць на фабрыках і заводах рабочымі, а 200 т.—служачыя, інжынэры, дактары, настаўнікі і інш. У некаторых прафсаюзах, напрыклад, на Украіне яўрэі складаюць вельмі высокі процант. Напрыклад, у саюзе гарбароў каля паловы яўрэяў, у саюзе швэйнікаў па Украіне тры чвэрткі ўсіх членаў, у саюзе дрэвапрацовачнікаў амаль адна трэць членаў яўрэі і г. д. Калі ўзяць з сем'ямі, дык каля мілёну належыць ужо цяпер да сем'яў рабочых і служачых яўрэяў. Значыцца, ужо за першыя дзесяць гадоў сотні тысяч яўрэяў уцягнуты ў вытворчую працу на фабрыках і заводах. Калі-б у нас ня было ніколі беспрацоўя, дык, вразумела, ніякі поп, ніякі нэпман не маглі-б гэта выкарыстаць проці яўрэяў. А цяпер, калі ёсьць беспрацоўе, клясавы вораг нашэптвае: вось, бачыш, цябе, Іваноў, скараціл, а яго, Рабіновіча, не скараціл, ён застаўся на працы. Зразумела, бываюць дзесяткі, сотні і тысячы выпадкаў адваротных, але на гэты раз вораг Іванова на вудачку

Праверка—самакрытыка—кантроль мас

Хто зрывае распаўсюджваньне беларускай літаратуры.

Бабруйскае аддзяленьне БДВ два гады вядзе барацьбу за ажыцьцяўленьне пастановы Акрнацкамісіі. Каляндароў няма, ёсьць толькі беларускія...

Гэта вельмі цікавая, а разам з тым і абураючая гісторыя, з якой мы азнаёмім чытача, бярэ свой пачатак яшчэ з кастрычніка 1926 году.

1-га кастрычніка 1926 году Бабруйская акруговая нацкамісія па дакладу аб выніках праверкі беларусізацыі ў кнігагандлюючых арганізацыях гораду пастанавіла: «**для грунтоўнага правядзеньня беларусізацыі па кнігарні аддзяленьня Белдзяржвыдавецтва прапанаваць загадчыку кнігарні тав. Любічу ў 2-хтыднёвы тэрмін увесьці ў свой склад працаўніка беларуса. Прапанаваць кнігарні БДВ прыняць меры да больш пашыранага і папулярнага прасоўваньня ўсёй беларускай літаратуры, газэты і інш. літаратуры ў райёны**».

Выпіска гэтай пастановы 18 кастрычніка была накіравана «**для ведама і няўхільнага выкананьня**».

Частка, так сказаць, афіцыйная і, на думцы працоўных, дасканальна правільная, а цяпер дазвольце перайсьці да апавяданьня тэй гісторыі, якую прыдзецца ў бліжэйшыя дні разьвязаць ужо Цэнтральнай Нацкамісіі пры ЦВК БССР.

Працаўнікоў, якія-б ведалі добра беларускую мову і сучасную беларускую літаратуру, у нас вельмі мала, а таму на месцы такога знайсьці не ўдалося і толькі 5 кастрычніка 1927 году Праўленьне Белдзяржвыдавецтва накіравала ў Бабруйск для працы кваліфікаванага працаўніка тав. Хаданава-камуніста, дэмабілізаванага камандзіра Чырвонай арміі.

Здаецца, чаго яшчэ лепшага чакаць, але гэта здаецца нам, а Бабруйскі акругком партыі разважае па-свойму...

Тав. Хаданаў акругкомам адкамандыроўваецца назад у Белдзяржвыдавецтва, бо трэба, кажа, сваім беспрацоўным даць працу і...

Праз некаторы час акругком накіраваў у аддзяленьне БДВ камуніста—былога загадчыка дому асьветы тав. Згурскага, які ні беларускай мовы, ні беларускай літаратуры ня ведаў і, нават больш таго, яго адносіны да беларускіх выданьняў вельмі яскрава малюцца наступным:

Пры запытаньні пакупцоў—ці ёсьць у вас календары, тав. Згурскі вельмі сур'ёзна адказваў.

«**Календарей нет, есть только белорусские**»...

А Алёша ў фельетоне «З новым ріком» яшчэ дзівіўся, чаму Белдзяржвыдавецтва слаба распаўсюджвае беларускі каляндар.

Бачыце, у Бабруйскім беларускі каляндар нават і не каляндар, а так, нешта сярэдняе.

Чаму?

Відаць, толькі таму, што ён выдадзены на беларускай мове, а мова гэта мужыцкая і далікатнаму чалавеку ня з рукі,—разважаў наш пазажаны тав. Згурскі.

Але ўрэшце справа не ў календарах, а ёсьць пастанова нацкамісіі, якая накіравана да няўхільнага выкананьня і загадчык кнігарні пытаўся яе ажыцьцявіць.

Каб прыняць на працу працаўніка добра ведаючага беларускую мову і кнігу—трэба каго-небудзь зволіць. Тут на сцэну зьяўляецца саюз і ня толькі не дазваляе звольніць, але яшчэ тлумачыць скарачэньне «антысэмітызмам» (усе працаўнікі яўрэі) і тонка намякае, што, мол, і ў газэце можа зьявіцца адпаведны артыкул.

«Увесьці ў склад супрацоўнікаў хоць аднаго беларуса які ведаў-бы добра мову, беларускую кніжку, культуру і быт мне не ўдалося з прычыны пратэсту прафсаюзу перад РСІ і Акругкомам»,—адказвае загадчык аддзяленьня на прапанову праўленьня Белдзяржвыдавецтва.

Між тым Цэнтральная Нацкамісія пры ЦВК БССР 3 мая 1928 г. па дакладу Белдзяржвыдавецтва адзначыла, што—„**справа распаўсюджваньня БДВ кніг на мовах нацменшасьці пастаўлена нездавальняюча, асаблі ва ў акруговых і райённых цэнтрах, што тлумачыцца адсутнасьцю належнай увагі з боку БДВ да справы распаўсюджваньня гэтай літаратуры і, галоўным чынам, адсутнасьцю належнага падбору кніжных працаўнікоў у гандлюючых аддзяленьнях БДВ**».

У сваей пастанове па дакладу Цэнтральная Нацкамісія паміж іншым запрапанавала БДВ **праверыць кніжных працаўнікоў у сэнсе іх падрыхтоўкі па гандлю кнігамі на ўсіх мовах, і ў выніку зрабіць патрэбныя перамашчэньні і зьмены асабістага складу апаратаў.**

Вось на падставе гэтай пастановы праўленьне Белдзяржвыдавецтва і прапанавала яшчэ раз Бабруйскаму аддзяленьню ўвесьці ў склад аднаго працаўніка добра ведаючага беларускую мову і літаратуру, але...

У Бабруйску народ упарты і, як мы ўжо ведаем, дыректывы Цэнтральнай Нацкамісіі там ня так лёгка ажыцьцявіць.

«Ня толькі ў Бабруйскім аддзяленьні БДВ супрацоўнікі ня ведаюць беларускай мовы і сучаснай літаратуры на мовах нацмен., а гэта ёсьць агульнае зьявішча большасьці супрацоўнікаў нашых аддзяленьняў.

Спробы зьмены працаўнікоў разьбіваліся аб вострую супярэчнасьць прафсаюзаў і падтрыманьне апошніх адказнымі ўстановамі некаторых акруг,"—скардзіцца БДВ у Цэнтральную Нацкамісію і просіць [illegible] цяпіць дырэктывы апошняй.

Мы спадзяёмся, што гэта вельмі абураючая гісторыя будзе падрабязна дасьледавана і вінаватыя ў зрыве распаўсюджваньня беларускай і іншай нацыянальнай літаратуры будуць прыцягнуты да адказнасьці.

З свайго-ж боку бабруйскім прафсаюзнікам з саюзу савгандслужачых парадзім часьцей бываць на дакладах па нацпалітыцы і запытацца ў вучня сямёхгодкі, што завецца антысэмітызмам.

В. Зайцоў.

Гомельскія „дельцы—секретники"

Пад суровы суд агідных безгаспадарнікаў.

Злачынная праца Чэрняка.

Былы загадчык Гомельскага аддзяленьня «Рудметалторга» Чэрняк выключна «працаваў на карысьць» нашага буржуйніцтва. Чэрняк кідаў грошы направа і налева, рабіў тое, што толькі ў галаву прыдзе. Прымаў на працу, каго сам хацеў, праводзіў сотні зусім непатрэбных камандыровак за межы БССР. Так, напрыклад: **у мінулым годзе на камандыроўкі патрачана каля 10.000 руб.**

Але гэта яшчэ ня ўсё. У Чэрняка была «сакрэтная» галіна працы—па загатоўках матар'ялаў.

Чаму Чэрняк вёў загатоўку матар'ялаў сакрэтна? Таму, што было дазволена рабіць загатоўку толькі ў Гомельскім райёне, а Чэрняк сакрэтным парадкам рабіў загатоўкі на ўсім СССР: пасылаў свайго спэца ў Ленінград, Кіеў, Адэсу і г. д., прычым плаціў за тавары высокія цэны.

Усю гэту загатоўку Чэрняк хаваў як ад РСІ, так і ад мясцовых органаў улады, а каб ніхто нічога ня ведаў, Чэрняк пісаў свайму спэцу Югельсону сакрэтныя службовыя запіскі.

Вось выгрымкі з сакрэтнай службовай запіскі, якую Чэрняк пісаў спэцу Юнгельсону ў Кіеў:

4. Держите строго в секрете ваше пребывание в Киеве, надо, что-бы Госпромцветмет не знал о наших операциях, в особенности Киевская контора РМТ.

5. Покупайте побольше, старайцесь все оформить в Гомеле (???).

9. Тов. Юнгельсон, плохо дело, нас накроют, ведь дубликаты из Киева будут и наверно ваша подпись. Срочно что-нибудь надо предпринять.

14. Правление ассигновало 3.400 руб. (по секрету) для подготовки бухгалтерии. (???).

Гэта толькі вядомыя нам «сакрэты» Чэрняка і Юнгельсона. А колькі невядомых!...

Новы «зав» Клейн пашоў па сьлядох Чэрняка.

Пасьля звальненьня з працы Чэрняка, загадчыкам аддзяленьня «Рудметалторга» быў назначан Клейн, які пашоў па сьлядох Чэрняка і нават цалкам захаваў яго «сакрэтную» дзейнасьць.

Аднойчы Клейн дае сакрэтны загад спэцу Юнгельсону, каб ён выехаў у Ленінград; прычым Клейн папярэдзіў Юнгельсона аб тым, што ён павінен захаваць поўную тайну, і калі РСІ запытае, чаго езьдзіў у Ленінград, то павінен адказаць, што камандыроўка была дадзена па Гомельскай акрузе, а ў Ленінград ён езьдзіў па сваёй ініцыятыве.

Мяккія вагоны... Гасьцініцы... «Гасьцявыя» камандыроўкі...

Клейн—чалавек з шырокім размахам: ён ніколі ў «жестком» вагоне ня езьдзіў, а ўсё ў мяккім—з фасонам і віншом.

Клейн любіў перапляціць і за гасьцініцу. Любіў Клейн і часта езьдзіць у камандыроўкі як у службовыя, так і ў «гасьцявыя». Так, напрыклад, Клейн пядаўна, едучы з Віцебску, заехаў на тры дні ў Магілеў да сваіх знаёмых і свалкоў, і за гэтыя тры дні таксама атрымаў камандыровачныя. Грошы раскідваў Клейн тысячамі, куды трэба і куды ня трэба.

Малое начальства робіць так, як і вялікае.

Гаворыць, што «які бацька, такія і дзеці», а ў „Рудметалторге"—якое начальства, такія і «подчиненные».

Мала таго, што ў самым аддзяленьні «Рудметалторга» агідныя злачынствы і безгаспадарчасьць, але і ў складах можна назіраць тое-ж самае. Досыць падаць адзін прыклад:

Загадчык Менскім складам аддз. «Рудметалторга» едзе ў камандыроку ў Гомель, каб высьветліць справу аб сямі рублёх, а на камандыроўку патраціў 13 руб.

Калі вінават, дык толькі на 50 процантаў.

Гомельская АКК—РСІ, даведаўшыся аб «дзейнасьці» Клейна, выклікала яго і пытае:

— У цябе, т. Клейн, ёсьць на плячох галава, ці не? Ці ведаеш ты тое, што сам робіш?

— Калі я вінават, дык толькі на 50 проц.,—адказаў, падумаўшы Клейн.

Гомельская АКК—РСІ, разгледзіўшы гэту справу, запрапанавала пракурору тэрмінова расьсьледаваць яе і ўсіх вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

Такіх разгільдзяеў, падрываючых наша будаўніцтва, рэвалюцыйны закон павінен сурова судзіць.

З. Таганскі.

Узоры „Белкустпромсаюзу"

У справаздачах Беларускага саматужна-прамысловага саюзу (скарочанай назвы на беларускай мове пакуль што няма) ня трудна заўважыць:

— Дасягнулі даваеннага ўзроўню...

— Ахапілі на 101 проц. саматужнікаў...

— Палепшылі якасьць вырабаў на 300 проц. у параўнаньні з 1925-1926 годам і г. д.

Як „Белкустпромсаюз" палепшыў якасьць сваіх вырабаў і як ён дасягнуў даваеннага узроўню, мы пераканаліся сёньня, убачыўшы паперку маскоўскай канторы Белпайгандлю.

Магілеўскі акруговы саюз саматужнікаў паслаў у РСФСР, па дублікату № 038-024, 19 лютага 1928 году, 2 пары жаночых бацінак. Пакупцы ад гэтых «бацінак» адказаліся, і просяць маскоўскую кантору Белпайгандлю параіць ім, як адчапіцца ад Магілеўскага саюзу саматужнікаў.

Вось як пакупцы апісваюць «узоры» магілеўскіх саматужнікаў:

У адным бацінку хром розных гатункаў. Ёсьць навалак лапні, навалак апойна, і саюзка яшчэ з нейкага неядомага гатунку. Падбіўка—зрэбная. Абсады лопнулі і адвальваюцца. Шнуркоў няма. Агульны выгляд бацінак—„хітраўскі".

Так і напісана—«выгляд хітраўскі». Вось да чаго магілеўскія саматужнікі дастукаліся. Хутка іх саміх будуць называць „хітраўцамі".

Далей пакупцы зазначаюць, што за 8 руб. 29 кап. можна купіць «Скараходаўскія» бацінкі, і няма патрэбы купляць іх у магілеўскіх саматужнікаў. Пакупцы кажуць, што гэтыя бацінкі не дасягнулі нават дапатопнага ўзроўню і адсылаюць іх туды, адкуль атрымалі. Да гэтага дадаюць, што калі і заказаныя 1.000 пар бацінак для Далёкага Ўсходу будуць гэткія, як «узоры», дык саматужнікі атрымаюць іх назад. Атрымаюць, зразумела, з аплатаю ўсіх расходаў па дастаўцы на Далёкі Ўсход і назад у Магілеў, а таксама з аплатаю няўстойкі і з растаржэньнем дагавору, прычым, апошняе магілеўскім саматужнікам таксама ўляціць у „капеечку".

Мы, з свайго боку, можам дадаць:

— Не спадзявайцеся на вырабы «кустпромсаюза». Кожная пара бацінак—адзін слапы, другі—кульгавы. Гэта і ня дзіва: тыя, што іх выробляюць, таксама ня лепшыя—Наркамсабес даўно хоча ўключыць іх у свае сьпісы.

Ул. Сем.

Плянавая няплянавасьць Менскага акрвыканкому

Нешта не вяе Менскаму акрвыканкому. Як толькі возьмеш тое ці іншае будаўніцтва, дык абавязкова сустрэнеш недарэчнасьць.

Аб чым толькі ўжо ня пісалася? Тут і халадзільнік, і цэнтральная малочная, і трамвай, і каналізацыя. Акрвыканкомаўская няплянавасьць распаўсюдзілася, нават і на будаўніцтва вясковых школ.

Зараз гутарка будзе аб будаўніцтве Барысаўскай міжрайённай больніцы.

Пабудова гэта распачалася яшчэ ў 1925-26 годзе. Як мы ўжо прызвычаіліся, пабудова па першаму праэкту павінна была каштаваць 360.000 руб. і разьлічана была на 2 гады. Між тым на пабудову ўжо затрачана куды болей і, як сьведчаць спэцыялісты, будзе каштаваць звыш 500000 руб.

Што ўжо зроблена на будаўніцтве?

Галоўны 2-паварховы корпус ужо гатоў, нават устаноўлена цэнтральнае ацяпленьне, праведзена каналізацыя, ваданаправодзі, пабудована калодзеж з ваданапорнай вежай; пабудованы дапаможныя будынкі—кухня, пральня, баня і г. д.

Галоўны корпус ужо гатоў—ужо можна было-б здаць работу.

Але няма сродкаў, каб паставіць матор, і нельга дабыць з калодзежу вады, каб выпрабаваць цэнтральнае ацяпленьне.

Менскі акрвыканком ужо вінен Белдзяржэстрою да 50000 руб. за будаўніцтва больніцы; каб скончыць усё будаўніцтва, трэба яшчэ гэтулькі-ж, бо корпус для лячэньня сухотных хворых яшчэ не перакрыт.

Праўда, Белдзяржэстрой, каб не псаваць зробленай работы па гэтаму павільёну, пачаў рабіць перакрыцьцё ў крэдыт, а ўсе іншыя работы спыніў.

Больш 2 гадоў некалькі сот тысяч рублёў ляжаць мёртвым капіталам, і колькі будуць яшчэ ляжаць,—сказаць вельмі цяжка, бо плянавая няплянавасьць Менскага акрвыканкому ў будаўніцтве вядома ўжо даўно ўсёй БССР.

Нам здавалася-б, што ўжо прышоў час сказаць:

— Досыць, таварышы! «Пашалілі»—і будзе.

ШЫРОКІ РАЗМАХ АРШАНСКАГА КАМГАСУ.

— Размах у рабоце—гэта самае галоўнае, — разважаюць працаўнікі Аршанскага аддзелу камунальнае гаспадаркі.

— Што правільна, то правільна,—падтрымалі ў свой час у Аршанскім акрвыканкоме загадчыка камгасу, зацьвярджаючы водпуск 12.000 руб. на набыцьцё заграніччнай пажарнай аўтамашыны.

Кажуць шмат яшчэ барацьбы прышлося нашым аршанцам вытрымаць пры праходжэньні бюджэту ў цэнтральных установах, але, урэшце, перамога засталася за людзьмі з размахам, і ўлетку 1927 году заграніччная машына прыбыла ў Воршу.

Урачысты выезд складанай аўтамашыны быў прызначан на сьвяточны дзень, каб больш шырока прадэманстраваць перад працоўнымі Воршы вялікую перамогу на фронце барацьбы з пажарамі.

Сьведкі апавядаюць, што сам загадчык камгасу ў гэты памятны дзень у парадной форме пажарнага сядзеў на аўтамашыне побач з шофэрам.

Гудзеў гудок машыны, а ззаду імчалася на конях пажарная дружына, ледзь пасьпяваючы за шматсільным маторам.

— Кішка слабая, не дагоніце,—усьміхаліся акрвыканкомаўцы. Адным словам, настрой быў вельмі прыпадняты, а тут яшчэ на акраіне гораду выпадкова загарэлася хата, і ўвесь горад паімчаўся глядзець, як цуд пажарнай тэхнікі праз пару хвілін пераможе стыхію.

Да гонару пажарных праз поўхвіліны былі разгорнуты рукавы, запрацавала машына, але...

Замест моцнага струменю, вада з брандсбойтаў давала дробныя брызгі, і добра, што пад рукамі аказалася старая ручная машына, якая выратавала становішча, а інакш стыхія ўзяла-б нямала ахвяр.

Гэта было ў 1927 годзе...

Зараз дарагая пажарная аўтамашына ўжо другі год стаіць бяз працы ў пажарнай пуні разам з коньмі і калёсамі.

Часам, выпадкова папаўшы ў пуню, певень узьляціць на машыну і свае ку-ка-рэ-ку апавяшчае аршанцаў аб дарэмна загінуўшым размаху мясцовых працаўнікоў і аб несвалачасова вывезеных заграніцу 12.000 руб. залатой валюты.

Не падлічылі аршанскія працаўнікі з размахам толькі аднаго, што такая машына патрабуе моцнага ваданраводу, якога ў Воршы яшчэ няма, і які мае будавацца гадоў праз тры.

Такім чынам, чатыры гады будзе ляжаць мёртвым капіталам 12.000 р., а машына ад «беспрацоўя», як сьведчаць спэцыялісты, псуецца.

В. З.

Жыцьцё і праца асьветніка.

Настаўнікі і краязнаўчая праца.

Настаўніцтва складае каля 70 проц. членаў нашых краязнаўчых арганізацый.

Прычыны гэтага зусім зразумелыя. Краязнаўства—грунт савецкай школы і кожны сьвядомы настаўнік працуе ў краязнаўчых арганізацыях, гэта дае яму магчымасьць не адрывацца ад жыцьця, трымаць сувязь школы з жыцьцём. Такім чынам ня штучна засноўваюцца новыя школьна-краязнаўчыя гурткі, школьна-краязнаўчыя музэі, ня штучна арганізоўваюцца школьна-краязнаўчыя выстаўкі, пачынаюць выдавацца школьна-краязнаўчыя часопісі, наладжваюцца школьна-краязнаўчыя экскурсіі, вечары і г. д.

Усё гэта—адзнакі культурнай рэвалюцыі, якую ня можа не праводзіць савецкая школа. Але побач з гэтым можна заўважыць і перазуменьне настаўнікамі значэньня краязнаўчай працы ў справе будаваньня новай савецкай школы. Усё часьцей назіраюцца выпадкі адыходу настаўнікаў ад гэтай працы, прызнаваньне яе працай, якая ня мае сэнсу і практычных вынікаў, адмаўленьне ўсялякай ролі краязнаўства ў справе правядзеньня культурнай рэвалюцыі.

Прывядзём адзін яскравы прыклад. У Круглянскім раёне існуе раённае т-ва краязнаўства, якое мае сувязь з райкомам КПБ, ЛКСМ, РВК. Апошняму нават ставіла свой інфармацыйны даклад. РВК, заслухаўшы даклад, вылучыў у праўленьне т-ва свайго працаўніка і разаслаў па сельсаветах і настаўніцкіх гурткох абежнік з прапановай дапамагаць усялякім чынам працы раённаму т-ву краязнаўства і яго ячэйкам на мясцох. Адным словам, праведзена ўся арганізацыйная праца па афармленьні т-ва. Але пасьля гэтага настаўнікі 7-кі, якія павінны быць прыкладам для другіх настаўнікаў, усе разам (апрача двох) на чале з загадчыкам вышлі са складу сяброў т-ва. Няўжо прычына ў мізэрных сяброўскіх узносах?

Другі прыклад. Часта самі вучні, так сказаць, «з нізоў» пачынаюць варушыць гэту працу, цікавіцца ёю і ўцягваць настаўнікаў у кіраваньне ёю. У тэй-жа Круглянскай 7-цы быў заснаваны фэнолёгічны пункт і вылучана адказнай за гэту працу выкладчыца прыродазнаўства. Здаецца, праца не цяжкая, лёгкая і цікавая для вучняў, з боку настаўніцы (вышэйшая адукацыя) патрэбна самая мінімальная ўвага да гэтай карыснай для дзяржавы ў цэлым працы, а між тым настаўніца нібы зусім забылася аб гэтым і фэнпункт існуе на паперы.

Пры такім становішчы прыходзіцца маладым камсамольскім і піянэрскім сілам, якія паступова пачынаюць на мясцох цікавіцца краязнаўствам, разьлічваць выключна на саміх сябе.

А ці-ж не абавязак настаўніцтва выхоўваць культурны маладняк вясковых краязнаўцаў?

А. Ш ів.

Вынікамі працы дзяліліся з бацькамі вучняў.

На днях 5-я школа гор. Менску, рабіла справаздачу перад бацькамі вучняў „0"—„3" груп аб дзейнасьці і працы школы за мінулы навучальны год. На сходзе —каля 250 бацькоў і значная частка вучняў, якія, з-за адсутнасьці месца, адсылаюцца да дому.

Каля 8 гадз. увечары загадчык абвяшчае пасяджэньне подсавету разам з бацькамі вучняў адчыненым. На павестцы дню справаздача аб дзейнасьці камітэту дапамогі школы і выніку працы школы за бягучы навучальны год. За 3 м-цы існаваньня камітэт школы сабраў і разьмеркаваў на розныя выдаткі звыш 300 руб. на дапамогу бяднейшым вучням школы. Праца і дзейнасьць камітэту прызнана здавальняючай і выказана шчырая падзяка бюро камітэту.

У справаздачы аб жыцьці і працы школы загадчык застанавіўся на надзвычайна цяжкіх умовах працы, дзякуючы адсутнасьці ўласнага памяшканьня, належнага абсталяваньня, і патрэбных дапаможнікаў у школе, а галоўнае, надзвычайнае перагружанасьці малодшых клясаў, дзе яны былі падвойнымі.

Ня гледзячы на цяжкасьць умоў, адміністрацыя і настаўніцтва справіліся з сваёй задачай і школа мае вялікія дасягненьні як з боку выкананьня і прапрацоўкі праграм, так і выхаваньня, ня гледзячы на тое, што сямейныя ўмовы ў жыцьці некаторых вучняў падчас былі супярэчнымі выхаваньню школы і яе працы. Школа на правільным шляху і далейшы росквіт яе забясьпечаны.

Шэраг бацькоў, выступаўшых па дакладу, апрача падзякі за працу настаўніцтву і адміністрацыі, падкрэсьлілі, што школа ўва ўсіх галінах працуе добра, чаму ў рэзалюцыі, прынятай аднагалосна, праца прызнана вельмі здавальняючай.

Сход скончыўся каля паловы дванаццатае. Як адміністрацыя, настаўніцтва, так і бацькі разышліся задаволенымі,—першыя тым, што іх праца знайшла належную ацэнку, а астатнія, — што дзеці іх знаходзяцца ў школе, якая дасьць належную асьвету і выхаваньне.

Прысутны.

Падагулілі навучальны год.

(Астраш.-Гарадз. райён).

Халодны дзень. Сівер пранізвае да касьцей. Перагонані сыплі дробны часты дождж. Дарога ўся ў лужынах. Вельмі цяжка было-б пазнаць, што гэта веснавы дзень, каб перад вачыма не мігацела маладая зелень поля і лесу.

Настаўніку пасьля працоўнай зімы гэта зелень гаворыць, што надыходзіць яго адпачынак. Патрэбна толькі зрабіць падрахункі зімовай працы.

З ўсіх канцоў райёну, у гэты халодны дзень, настаўнікі зьбіраліся ў свой асяродак, каб падагуліць гадовую працу. Надворʼе пашкодзіла пачаць працу з раніцы.

Настаўнік зьявіўся на заключную гадовую канфэрэнцыю паддічыць, што і як зроблена, каб ў далейшым працу паленшыць.

Падрахункі па выкананьні праграм...

У райёне маюцца тры групы школ, якія па ўмовах вытворчай працы не аднолькавы.

Першы канцэнтр сямігодкі і дзьве чатырохгадовыя школы маюць большменш спрыяючыя ўмовы для працы. Дэталізаваныя праграмы грунтоўна выканалі. У напрамку карысна-грамадзкай і краязнаўчай працы пажадана паленшаньне. Чатырохгодні практыкавалі фізвыхаваньне і сьпевы.

Большасьць школ у райёне двухкамплектавыя. Пры разглядзе падрахункаў па выкананьні праграм у гэтых школах заўважана неабходнасьць нязначных зьмен у бок спрашчэньня ў комплексе Беларуь і СССР.

Аднакамплектавыя школы працавалі па комплексной сыстэме першы год і падрахунак працы паказаў, што комплексная сыстэма жыцьцёва і ў гэтых школах.

Ад цямна і да цямна...

Перашкоды ў працы школ па выкананьні праграм, як кароткі навучальны год, не акуратнае наведваньне школы вучнямі, патрабуюць для зьнішчэньня гэтых перашкод катэгарычных мерапрыёмстваў, асабліва ў школах з абавязковым навучаньнем.

Як ні дзіўна, а значная частка настаўніцтва заявіла, што гэты недахоп панаўняўся працай ад зары і да зары, ад цямна і да цямна. Гэта ненармальнасьць як з боку аховы працы, так і з пэдагагічнага недапусьціма.

Каб не калечыць непасільнаю працаю дзяцей і мець нейкую норму працы настаўніку, патрэбна зьнішчыць гэты галоўны тормаз нармальнай і плянавай працы школ.

Не прайшоў бяз увагі канфэрэнцыі цікавы для гэтага году і ня зусім зразумелы факт, што вынікі працы першага канцэнтру райённай сямігодкі, выяўленыя пры выпуску IV груп, па выкананьні праграм ня розьняцца ад вынікаў двухкамплектавых школ.

Мэтадычная праца.

У гэтым годзе ўжо ўсе пашыраныя пэдсаветы ў тэй ці іншай меры праводзілі працу па падвышэньні кваліфікацыі настаўніцтва. Асяродкам усёй мэтадычнай працы былі практычныя лекцыі.

У далейшым практычныя лекцыі павінны мець загадзя распрацаваны плян ці канспэкт, увязаны з плянам працы пэўнай школы. Плян працы рай. мэт. бюро і пашыраных пэдсаветаў трэба складаць больш сьціслы і канкрэтна. Сыстэма і мэтады працы пазічаны правільнымі. Выказана пажаданьне аб жывой сувязі паміж рэўналеглымі мэтадычнымі аб'яднаньнямі ў межах райёну і акругі.

Заўважана, што праробленая праца ў напрамку падвышэньня кваліфікацыі дала палепшаньне вытворчасьці. **Б. К.**

Узорная праца.

Магілеў 12-VI. Сухароўская ячэйка «Прэч Няпісьменнасьць» налічвае 57 сяброў, якіх яна здолела ўцягнуць у практычную працу.

На сродкі ячэйкі працаваў лікпункт, які выпусьціў 27 граматных, у тым ліку 24 жанчыны.

Кожны з скончыўшых лікпункт знайшоў сабе месца, каб удасканаліць здабытыя веды: гурток самаадукацыі пры ячэйцы, бібліятэка, выпіска газэты, праца ў насьценагазэце і г. д.

Півень і Забаўскі забаўляюцца.

Нам вучням 7 шк. Заходніх чыгунак 6 групы «г» і 6 групы «е» было абвешчана, што а 9 гадзіне раніцы 3 чэрвеня мы пойдзем у экскурсію.

У вызначаны тэрмін сабраліся і накіраваліся ў Шэйпічы.

Прышлі. Настаўнікі Півень і Забаўскі далі нам заданьні і сказалі пачакаць гадзіну, а самі некуды пайшлі.

Чакаем гадзіну, чакаем другую. Частка вучняў разышлася.

Праз дзьве гадзіны настаўнікі прышлі.

Але ім ужо было не да заняткаў, бо яны ня толькі займацца не маглі, а і гаварыць ім было цяжка—зразу было відаць, што перабралі «хлебнай».

З далейшых заняткаў у нас нічога ня вышла і мы прымушаны былі пайсьці дахаты, дарэмна страціўшы дзень.

А настаўнікі зайшлі па дарозе да селяніна—бацькі аднаго нашага вучня і яшчэ раз «падмацаваліся» хлебнай.

Мы лічым, што такія паводзіны не падыходзяць да настаўнікаў савецкае школы.

Падпісана чатырмя вучнямі.

А настаўнікі бяз пэнсіі.

(Плешчаніцкі р., Меншчына).

Яшчэ задоўга да канца заняткаў марыў настаўнік аб часох, калі ён зможа пасхаць і па экскурсію, і ў горад Менск, і ў дом адпачынку.

І з яшчэ большай напружанасьцю браўся настаўнік за цяжкую сваю працу.

І вось скончыліся заняткі ў школе. Апошняя канфэрэнцыя адбылася. Настаўнікі атрымалі двухмесячны водпуск.

Але... ілюзіі настаўніка ў канцы мая перавярнуліся ў бязьлітасную сапраўднасьць: ён і па сёньнешні дзень сядзіць, але ўжо без усялякіх платуценьняў, бо ня толькі не далі яму пэнсіі за месяц ці за два наперад, згодна заключанай мясцкомам умовы, але не далі нават і за май месяц. І толькі частка настаўнікаў мела «шчасьце» атрымаць пэнсію за... май.

Ну, а рэшта настаўнікаў жывуць марамі.

А можа-б хто-небудзь дапамог атрымаць пэнсію за май, бо ў хаткім часе трэба брацца за рамонт школ, а шмат хто хоча зьезьдзіць куды-небудзь праветрыцца.

Таўро.

Чым гэта тлумачыцца?

Справавод Бобрскай 7-кі да гэтага часу атрымлівае па 14 руб. у месяц, ня гледзячы на тое, што на Аршанскай акрузе стаўка справаводу сямігодак 28 руб. і што ў Бобрскай сямігодцы—тры пятыя групы, дзьве шостыя, сёмая і 0-4 гр. малодшых, а таксама ёсьць вучнёўскі інтэрнат. Такім чынам нагрузка вельмі значная, больш, чым у тых сямігодках, дзе выдаецца 28 руб. За дапамогай справавод стары сябра саюзу Працасьветы, зьвярнуўся ў мясцком працаўнікоў асьветы Крупскага райёну, але апошні па традыцыі такімі справамі не займаецца і маўчыць бо ён і на Барысаўшчыне быў „притчей во языцех", такім застаўся і на Аршаншчыне.

За дапамогай зьвярнуліся да акруговага інспэктара Нарасьветы, абгледаўшаму школу. Той адказаў проста: «разьмяркуйце працу на 14 руб.» Вялікі жартаўнік, дзядзька-інспэктар, бо вам добра вядома стаўка справавода па вашай акрузе і што 172 руб. у год,—сума для маленькіх людзей вялікая.

Ц. Пр. Саюзу Прац. Асьв. і РСІ, зьвярніце ўвагу на гэткую ненармальнасьць і зрабіце належную прапанову Крупскаму РВК выплаціць належную стаўку, як гэта павінна быць згодна закону.

Знаёмы.

Можа ЦП дапаможа?

У мінулым годзе быў зволен з пасады загадчык Заречанскай школы, Плешчаніцкага райёну, Менск. акр. т. Сокалаў.

Камісію па расьсьледваньню «злачынства» і звальненьню Сокалава складалі... Трафімаў, Казлоў і Грынкевіч—усім вядомыя «типы» Плешчаніцкага РВК.

Як ні дамагаўся прадстаўнік ад мясцкому працасьветы т. Шаланда даведацца аб прычынах звальненьня—яму быў ад пасьлянёнай тройцы адказ:

— Секретно,—14-й погран-отряд не велит выдавать «тайны преступления».

І сябра мясцкому, пад націскам такіх моцных асоб, ня ведаючы прычыны, падпісвае прыгавор аб звальненьні з пасады Сокалава.

Цяпер-жа, калі «рабы бахуса» пакінулі тэрыторыю Плешчаніцкага райёну, высьветлілася, што пагран-атрад ня ведае ніякага «тайного преступления» за Сокалавым.

Прабавалі капацца ў справах РВК—нідзе няма дакумента, на падставе якога Сокалаў зволен з пасады.

Кляймо.

У САВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР.

(Пасяджэньне 11 чэрвеня 1928 г.).

Па гэтым пасяджэньні пад старшынствам т. Галадзеда М. М. разам з іншымі былі разгледжаны наступныя пытаньні.

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ 195.000 РУБ. НА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ ІНВАЛІДАЎ.

Асыгнаваныя з 5-міліённага фонду на ўзмацненьне выдаткаў па забесьпячэньні інвалідаў 195 тыс. руб. СНК пастанавіў абярнуць на працоўнае ўпрадкаваньне і на перавучаньне інвалідаў. Гэтая сума разьмяркоўваецца так: 65 тыс. руб.—Беларускаму Саюзу інвалідаў каапэрацыі ў якасьці доўгатэрміновай бяспроцантнай пазыкі і 130 тыс. руб. разьмяркоўваецца па акругах: Бабруйскай—15 тыс. руб., Віцебскай—20 тыс. руб., Гомельскай—20 тыс. руб., Менскай—16 тыс. руб., Мазырскай—10 тыс. руб., Аршанскай—15 тыс. руб. і Полацкай—15 тыс. руб.

АБ ПАРАДКУ ВЫЛІЧЭНЬНЯ АДМІНІСТРАЦЫЙНА-КІРАЎНІЧЫХ ВЫДАТКАЎ НА 1928-29 Г.

На падставе пастановы СНК СССР за 15-У г. г. СНК пастанавіў, каб усе ведамствы і ўстановы, якія знаходзяцца на дзяржаўным і мясцовым бюджэтах, разьлілі вылічэньні асыгнаваньняў на адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі па каштарысах на 1928-29 бюджэтны год, выходзячы з наступных асноўных палажэньняў: а) па каштарысах 1928-29 г., апроч замацаваньня праведзеннага ў 1927-28 г. скарачэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў, павінна быць прадугледжана далейшае зьніжэньне гэтых выдаткаў. Гэтае зьніжэньне павінна ажыцьцяўляцца праз рацыяналізацыю апарату, праз зьнішчэньне лішніх функцый, спрашчэньне справаздачнасьці, скарачэньне выдаткаў на камандыроўкі, на ведамсьцьвенныя выданьні і г. д.; б) асыгнаваньні, прадугледжаныя па каштарысах на 1927-28 г. на такія патрэбы, якія мелі месца толькі ў бягучым годзе і ня будуць паўтарацца ў будучым, павінны быць выключаны пры вызначэньні ўзроўню адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў на 1928-1929 г. Сродкі на новыя патрэбы адміністрацыйна-кіраўнічага характару павінны быць адшуканы ў каштарысе данага ведамства або ўстановы за кошт эканоміі ад скарачэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў, у пасобку за лік унутранае арганізацыйнае перабудоўкі апарату.

У кожным выпадку агульная сума адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў па каштарысу кожнага ведамства ці ўстановы, улічваючы і выдаткі на новыя патрэбы, не павінна перавышаць агульнай сумы адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў, якая была прызначана данаму ведаству ці ўстанове па бюджэту на 1927-28 г.

АБ ТЭРМІНАХ ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЯ Ў БССР.

СНК разглядзеў пытаньне аб магчымых тэрмінах скасьцэньня земляўпарадчых работ у БССР і прызнаў неабходным скончыць земляўпарадкаваньне ў БССР на працягу 5 гадоў. Дзяржпляну даручана пры разглядзе 5-гадовых плянаў разьвіцьця народнай гаспадаркі вызначыць сумы і крыніцы фінансаваньня земляўпарадчых работ у БССР, а таксама ўстанавіць парадак чарговасьці работ.

АБ СПАГНАНЬНІ МЯСЦОВАГА ПАДАТКУ І ЗБОРУ З ЦЯЖАРАЎ НА СТАНЦЫЯХ ЯСЕНЬ, САЛТАНАЎКА І ГАРО

У Эканамічнай Нарадзе пры СНК БССР.

(Пасяджэньне за 11 чэрвеня '28 г.).

АБ ПАРАДКУ ВОДПУСКУ ЛЕСУ Ў 1928-29 Г.

Эканамічнаю Нарадаю была прынята пастанова аб парадку водпуску лесу ў 1928-29 г. Паводле гэтай пастановы лес адпускаецца на карню аспоўнікам лесазагатоўчымкам: Лесбеду, Лесазагатоўчаму Аддзелу НК Земляробства, Жылкаапрацыі, Дзьвіналесу і чыгункам. Усе іншыя дзяржаўныя лесаспажыўцы павінны набываць драўніну ў гэтых загатоўшчыкаў. Патрэбы насельніцтва ў лесе будуць таксама забяспечаны, прычым арандатарам омалакураных вучасткаў асмол і важныя дровы будуць адпускацца па таксах 1924 г. (г. зн. па самых танных цэнах) без ганлёвай надбачы.

Для бяднейшага сельскага насяленьня і калектыўных гаспададак устанаўліваецца дарэмны і льготны водпуск драўніны, а таксама і водпуск у крэдыт праз Белсельбанк, прычым для гэтай мэты ўстанаўляюцца фонды: для дарэмнага і льготнага водпуску ў суме 400 т. р., для крэдытаваньня ў суме 900 тыс. руб. Гэтыя фонды разьмяркоўваюцца ў цэнтры Лясным Аддзелам НК Земляробства разам з прадстаўнікамі НК Фінансаў, Камітэту Сялянскай Узаемадапамогі і Белсельбанку, а ў округах, раёнах і сельскіх мясцовасьцях—адпаведнымі мізавымі ўстановамі.

АБ ДАПАМОЗЕ БЕДНАЦЕ.

Эканамічнаю Нарадаю быў заслуханы даклад аб дапамозе сялянскай беднаце.

Эканамічная Нарада адзначыла, што ўсякіх фондаў для дапамогі беднаце ў 1927 г. было на суму 3469 тыс. руб. Эканамічная Нарада прызнала мэтагодным павялічыць агульную суму дапамогі беднаце на 27-28 г. да 5 млн. руб.

ЗАЦЬВЕРДЖАНЬНЕ СТАТУТАЎ.

Эканамічнаю Нарадаю былі зацьверджаны праэкты тыпавых статутаў: камуны, сельска-гаспадарчай арцелі і таварыства па грамадзкай апрацоўцы зямлі.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Палажэньне

пра Інстытут Аховы Працы пры Народным Камісарыяце Працы БССР.

1. Задачамі Інстытуту Аховы Працы пры Народным Камісарыяце Працы БССР зьяўляюцца:

а) навукова-практычная распрацоўка розных пытаньняў аховы і арганізацыі працы;

б) прафесыянальны адбор і дапамога выбраць прафесію;

в) кансультацыя аб розных пытаньнях санітарнае і тэхнічнае аховы працы і дапамога правядзеньню санітарна-тэхнічных мерапрыёмстваў на прадпрыёмствах БССР;

г) кіраваньне работаю санітарных і тэхнічных інспэктараў, школ і дзіцячых устаноў у галінах санітарыі, гігіены, прафесыянальнага адбору і дапамогі выбіраць прафесію;

д) прапаганда ідэй аховы працы;

е) удзел і дапамога педагагічнай працы ў галінах, уваходзячых у кампетэнцыю Інстытуту.

2. На чале Інстытуту стаіць дырэктар, які назначаецца Народным Камісарам Працы.

3. При Інстытуце ёсьць Савет, які выслухоўвае даклады аб працы Інстытуту, зацьверджае агульныя планы яго работы і кантролюе ажыцьцяўленьне мерапрыёмстваў Інстытуту.

4. У склад Савету ўваходзяць: дырэктар Інстытуту, тры прадстаўнікі Народнага Камісарыяту Працы, два прадстаўнікі Цэнтральнага Савету Прафесыянальных Саюзаў, два прадстаўнікі Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі і па аднаму прадстаўніку Галоўнага Кіраўніцтва Сацыяльнага Страхаваньня, Народнага Камісарыяту Аховы Здароўя, Народнага Камісарыяту Асьветы, Беларускага Аддзяленьня Цэнтральнага Інстытуту Працы, Асацыяцыі Навуковае Арганізацыі Працы, Дэканату Медыцынскага Факультэту Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, Катэдры Псыхатэхнікі Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту і Інстытуту Сацыяльнае і Агульнае Гігіены Народнага Камісарыяту Аховы Здароўя.

Пасяджэньні Савету адбываюцца ня менш, як адзін раз на тры месяцы.

5. Інстытут Аховы Працы пры Народным Камісарыяце Працы БССР складаецца з:

а) лябараторыі прамысловае гігіены;

б) лябараторыі фізіолёгіі працы;

в) псыхатэхнічнае лябараторыі;

г) аддзяленьня тэхнікі забясьпекі і санітарнае тэхнікі;

д) музэю працы;

е) габінэту статыстыкі.

6. Лябараторыя прамысловае гігіены даследуе прафесыянальныя шкоднасьці вытворчасьці, вывучае і распрацоўвае фізычныя і хімічныя спосабы адхіленьня прамысловых шкоднасьцей, вышукае найбольш дасканалыя і практычныя мэтады даследаваньня.

7. Псыхатэхнічная лябараторыя арганізуе дапамогу выбіраць прафесію і прамысловы і педагагічны псыхатэхнічны падбор, вывучае пытаньні псыхалёгіі працы, псыхалёгічнае клясыфікацыі прафесій.

8. Аддзяленьне тэхнікі забясьпекі і санітарнае тэхнікі вывучае прычыны няшчасных выпадкаў, вывучае і распрацоўвае перасьцярожныя канструкцыі, вэнтыляцыйныя устаноўкі, вывучае пасобныя нашчасныя выпадкі паводле асобных заданьняў; дае кансультацыю аб пытаньнях вэнтыляцыі, асьвятленьня і аналу прамысловых прадпрыёмстваў.

9. Музэй аховы працы складае экспанаты на пытаньнях аховы працы і сацыяльнага страхаваньня, зьбірае матэр'ялы аб становішчы аховы працы ў прамысловасьці БССР, выробляе паказальныя дапаможнікі, вядзе санітарна-асьветную работу ў галіне аховы працы.

10. Кабінэт статыстыкі распрацоўвае статыстычныя матэр'ялы ўсіх аддзяленьняў Інстытуту і робіць навукова-статыстычны аналіз матэр'ялаў па аховае працы і сацыяльным страхаваньні.

11. Інстытут мае права арганізоўваць курсы для вывучэньня пытаньняў аховы працы і для навуковага ўдасканаленьня працаўнікоў па аховае працы.

12. Інстытут мае права выдаваць свае працы на пасобных галінах дзейнасьці Інстытуту.

13. Сродкі Інстытуту складаюцца з асигнаваньняў са сродкаў дзяржаўнага бюджэту БССР і са спэцыяльных сродкаў: платы за правядзеньне работ па заданьнях розных устаноў і з дапамог зацікаўленых ведамстваў і інш.

14. Інстытут мае пячатку з надпісам: «Інстытут Аховы Працы пры Народным Камісарыяце Працы БССР».

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. **Галадзед.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Н. **Угараў.**

2 чэрвеня, 1928 г.
г. Менск.

Положение

об Институте Охраны Труда при Народном Комиссариате Труда БССР.

1. Задачами Института Охраны Труда при Народном Комиссариате Труда БССР являются:

а) научно-практическая разработка различных вопросов охраны и организации труда;

б) профессиональный отбор и содействие в выборе профессии;

в) консультация по различным вопросам санитарной и технической охраны труда и содействие проведению санитарно-технических мероприятий на предприятиях БССР;

г) руководство работой санитарных и технических инспекторов, школ и детских учреждений в областях санитарии, гигиены, профессионального отбора и содействия в выборе профессии;

д) пропаганда идей охраны труда;

е) участие и содействие педагогической работе в областях, входящих в компетенцию Института.

2. Во главе Института стоит директор, назначаемый Народным Комиссаром Труда.

3. При Институте состоит Совет, который заслушивает доклады о работе Института, утверждает общие планы его работы и содействует осуществлению мероприятий Института.

4. В состав Совета входят: директор Института, три представителя Народного Комиссариата Труда, два представителя Центрального Совета Профессиональных Союзов, два представителя Высшего Совета Народного Хозяйства и по одному представителю Главного Управления Социального Страхования, Народного Комиссариата Здравоохранения, Народного Комиссариата Просвещения, Белорусского Отделения Центрального Института Труда, Ассоциации Научной Организации Труда, Деканата Медицинского Факультета Белорусского Государственного Университета, Кафедры Психотехники Белорусского Государственного Университета и Института Социальной и Общей Гигиены Народного Комиссариата Здравоохранения.

Заседания Совета происходит не реже одного раза в три месяца.

5. Институт Охраны Труда при Народном Комиссариате Труда БССР состоит из:

а) лаборатории промышленной гигиены;

б) лаборатории физиологии труда;

в) психотехнической лаборатории;

г) отделения техники безопасности и санитарной техники;

д) музея труда;

е) кабинета статистики.

6. Лаборатория промышленной гигиены исследует профессиональные вредности производства, изучает и разрабатывает физические и химические способы устранения промышленных вредностей, изыскивает наиболее усовершенствованные и практические методы исследования.

7. Психотехническая лаборатория организует содействие в выборе профессии и промышленный и педагогический психотехнический подбор, изучает вопросы психологии труда, психологической классификации профессий.

8. Отделение техники безопасности и санитарной техники изучает причины несчастных случаев, изучает и разрабатывает предохранительные конструкции, вентиляционные установки, изучает отдельные несчастные случаи по особым заданиям, дает консультацию по вопросам вентиляции, освещения и отопления промышленных предприятий.

9. Музей охраны труда составляет экспонаты по вопросам охраны труда и социального страхования, собирает материалы о состоянии охраны труда в промышленности БССР, изготовляет показательные пособия, ведет санитарно-просветительную работу в области охраны труда.

10. Кабинет статистики разрабатывает статистические материалы всех отделений Института и производит научно-статистический анализ материалов по охране труда и социальному страхованию.

11. Институт имеет право организовывать курсы для изучения вопросов охраны труда и для научного усовершенствования работников по охране труда.

12. Институт имеет право издавать свои труды по отдельным отраслям деятельности Института.

13. Средства Института составляются из ассигнований из средств государственного бюджета БССР и из специальных средств: платы за проведение работ по заданиям разных учреждений и из пособий заинтересованных ведомств и др.

14. Институт имеет печать с надписью: «Институт Аховы Працы при Народным Камисарыяте Працы БССР».

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. **Голодед.**

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР Н. **Угаров.**

2 июня, 1928 года.
г. Минск.

Сялянскія вырабы—на экспарт.

Пры выяўленьні ўсіх нашых магчымасьцяў у галіне адшуканьня новых відаў экспарту, Белдзяржгандаль пастанавіў экспартаваць заграніцу сялянскія ручныя вырабы. Яшчэ ў даваенны час хатнія вырабы нашых сялян мелі значны попыт на замежных рынках. Гэтыя вырабы некаторых нават цікавілі, як «народнае мастацтва», як каштоўныя прадметы, лічачы таму, што яны вырабляюцца ручным спосабам.

Да такіх прадметаў належаць так званыя сялянскія гальштукі, коўдры, розныя ткацкія і ганчарныя вырабы, якія вырабляюцца ва ўсіх куткох Беларусі і маюць вялікую каштоўнасьць.

Бясспрэчна, што пры ўважлівых адносінах можна выявіць цэлы шэраг такіх вырабаў. Трэба значна пашырыць гэту справу, якая можа зьявіцца новым таварам у нашым экспартным балянсе.

Белдзяржгандаль ужо разаслаў дырэктывы і ўказаньні на ўсіх сваіх пунктах і агенцтвах аб неабходнасьці выяўленьня хатніх вырабаў і трэба спадзявацца, што працаўнікі на мясцох з належнай увагай адносяцца да гэтай справы.

Д. Эс.

ХРОНІКА.

Барцьба з безгаспадарчасьцю.

(Па матэр'ялах НК РСІ).

ЯК «ЗАРАБІЛА» БДВ.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва закупіла для распаўсюджаньня ў БССР 100000 календароў, выпушчаных 1-й узорнай друкарняй у Маскве. Гэтыя календары аказаліся з дэфэктамі, у выніку чаго іх прышлося перашываць, на што БДВ затрацила 400 руб. А зьмест таго, БДВ за гэтых календарох страціла яшчэ цэлых 6000 рублёў.

За такую безгаспадарчасьць Беларускаму Дзяржаўнаму Выдавецтву абвешчан выгавар.

ЗА БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ — ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

РСІ выявіла злачынную безгаспадарчасьць у працы гандлёва-будаўнічага трэсту Менскага АВК: здача матэр'ялаў адным загадчыкам базай другому рабіваецца бяз усякіх актаў, вялікі нахват тавараў, адсутнасьць пажарнай аховы, растраты, выплата за прастой і шэраг іншых ненармальнасьцей.

Калегія НК РСІ даручыла Менскаму АВК зараз-ж правесьці рэвізію і прыцягнуць вінаватых да судовай адказнасьці.

УВАГА ДА КРЫТЫКІ ПРАЦОЎНЫХ.

НК РСІ загадаў усім прадпрыемствам Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі аб узмацненьні ўвагі да крытыкі працоўнымі розных недарэчнасьцяў. У гэтым загадзе гаворыцца, што трэба дакладна вывучаць канкрэтныя скаргі і прапановы рабочых і сялян і заразжа рабіць загады да зьнішчэньня недахопаў. Аб выніках расьсьледаваньня работнікі РСІ павінны інфармаваць на масавых сходах рабочых і сялян і высьвятляць справы ў насьценных газэтах.

Што чуваць на будаўнічым фронце.

Воддуг інфармацыі Белдзяржстрою, у Менску будаўнічыя работы пачынаюць патроху разгортвацца. Так, для фабрыкі «Миншвей» ужо пачалася закладка фундаманту. Поўным тэмпам разгарнуліся работы на пабудове фармазаводу: ужо скончан першы паверх і распачынаецца кладка другога. Ідуць больш-менш нармальна работы і на заводзе «Дрэваапрацовачнік»; будуецца новая сушыльня, пераабсталёўваецца стары корпус і інш.

Прыступлена ўжо да капаньня катлавану пад корпус галянтарэйнай фабрыкі.

Горш справа в Унівэрсытэцкім Гарадком. Ужо закладваецца фундамант для мэдыцынскага і акадэмічнага карпусоў, а для іншых карпусоў няма яшчэ рабочых чарнёжоў.

На ўсіх будаўнічых работах па Менску ў Белдзяржстрої павінна было-б быць занята 1200-1300 рабочых, а занята пакуль што ня 800 чалавек.

Па округах справа ў Белдзяржстрої стаіць так: на Аршанстрої пачалі перакрыцьцё даху 2 будынкаў; хутка будзе скончан трэці будынак.

У Віцебск выехалі прадстаўнікі Белдзяржстрою і слесар для высьвятленьня месца пабудовы Клюбу мотаністаў. Атрыманы чарцёжы для Барысаўскага клюбу хэмкаў, і ў бліжэйшым часе будзе прыступлена да закладкі фундаманту. Будаўніцтва запалкавай фабрыкі „Чырвоная Бярэзіна" пасоўваецца наперад: ужо адбываецца кладка фундаманту для электрастанцыі.

З 1-га ліпеня мяркуецца распачаць пабудову заводу сельска-гаспадарчых машын у Гомелі.

Аб аслабаненьні тав. Сэгаля М. А. ад абавязкаў Народнага Камісара Юстыцыі БССР і Пракурора Рэспублікі.

Прэзыдыум ЦВК, у зьвязку з пераходам тав. СЭГАЛЯ М. А. на навуковую працу у РСФСР, пастанавіў здавольніць яго хадайніцтвае аб аслабаненьні яго ад абавязкаў Народнага Камісара Юстыцыі БССР і Пракурора Рэспублікі.

Часовае выкананьне абавязкаў Народнага Камісара Юстыцыі БССР і Пракурора Рэспублікі ўскладзена на тав. ГОХМАНА С. М.

Выступаўшыя члены Прэзыдыуму ЦВК адзначалі карысную працу тав. СЭГАЛЯ, як Народнага Камісара Юстыцыі БССР і Пракурора Рэспублікі на працягу кала трох год. Пры непасрэдным удзеле тав. СЭГАЛЯ за апошні час былі распрацаваны і зацьверджаны Урадам БССР Канстытуцыя БССР, Кодэкс аб шлюбе, сям'і і апецы, справядзельна-працоўны Кодэкс і іншыя важнейшыя заканадаўчыя акты.

Пабудова новага цагельнага заводу.

У бліжэйшым часе Белдзяржкотрой прыступае да пабудовы новага цагельнага заводу. Досьледы ўжо скончаны. Новы завод будзе будавацца побач з 3-ім цагельным заводам у г. Менску. Новы завод разьлічан на штогодні выпуск 5 мілёнаў цэглы. Ёсьць надзея, што яшчэ ў сёлетнім будаўнічым сэзоне завод выпусьціць звыш 1000000 штук цэгры.

Аб'яднаньне Віцебскай і Гомельскай савпартшкол.

Наркамасьветы пастанавіў з 20-га чэрвеня аб'яднаць Віцебскую і Гомельскую савецкія партыйныя школы II ступені. Школа будзе знаходзіцца ў Гомелі; з наступнага вучэбнага году пры ёй будзе адчынена яўрэйскае аддзяленьне.

Слухачы I-га курсу і яўрэйскага аддзяленьня Віцебскай савпартшколы будуць пераведзены на другі курс Гомельскай школы.

У Менск прыехаў т. Зорын.

Сёньня ў Менск прыехаў старшыня Міжнароднага Дзіцячага Бюро пры КІМ'е тав. Зорын.

Тав. Зорын прачытае шэраг дакладаў аб міжнародным дзіцячым руху на ўсебеларускіх курсах старшынь райпіянэрбюро і на агульнагарадзкім актыве піянэрскіх працаўнікоў Менску.

Новы савет Белкаапсаюзу.

3-ці зьезд упаўнаважаных Белкаапсаюзу на заключным пасяджэньні абраў новы савет Белкаапсаюзу. У склад савету абрана 45 членаў, у ліку якіх т. т. Васілевіч, Левінаў, Ісаеў, Араноўіч, Адамайціс, Зінгерман і інш. Новае праўленьне БКС абрана ў складзе наступных асоб: Наўлянскі (старшыня), Кумкес (нам. старш.) Фальковіч, Флеер, Кутай, Буры і Бобікаў.

У рэвізійную камісію абрана 5 чалавек.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

(НА 14-VI 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз.—прад. 4—58, куп. 4—56.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—07,5, куп. 5—05,5.

Абл. 2 сял. паз.—куп. 5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—02,5, куп. 5—00,5.

Абл. 10 пр. паз. 27 г.—прад. 25—60, куп. 25—50.

Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 120—25, куп. 118—25.

Абл. 12 проц. паз.—прад. 100—45, куп. 100—40.

Абл. 6 проц. паз. індустр.—прад. 24—62, куп. 24—52.

Дапамога інвалідам грамадзянскай вайны і б. чырвоным партызанам.

Кар. Кам. Сацыяльнай Забясьпекі разьмеркаваў па округах са сродкаў вайсковага падатку, які зьмяшчаецца з асоб, падлягаючых запісваньню ў тылавое апалчэньне, 3200 р. на дапамогу інвалідам грамадзянскай вайны і былым чырвоным партызанам.

Усяго з 1 кастрычніка 1927 г. да гэтага часу са сродкаў вайсковага падатку было разьмеркавана паміж інвалідамі грамадзянскай вайны і былымі чырвонымі партызанамі 17436 руб.

Менскі дзень.

Дом адпачынку для дзяцей рабочых адчыніць Менскі аддзелам ЛКСМБ у м. Дукоры, Менскай акругі.

На арганізацыю гэтага дому адпушчана 4000 руб.

За летні сэзон гэты дом адпачынку мае пропусьціць 200 дзяцей.

700 бібліятэчак, коштам 30 руб. кожная, будзе разьмеркавана па тых школах Менчыны, дзе няма кат-чытальні і нардомаў.

97 клюбаў і 32 хаты-чытальні знаходзяцца ў савецкіх гаспадарках Белсельтрэсту. За апошні год у іх было праведзена 5600 лекцый і гутарак.

СУД.

СТУДЭНТКА-КАНТРАБАНДЫСТКА.

Рыва-Мэра Плоткіна ў 1923 годзе нелегальна перайшла з Польшчы ў БССР. Бацькі Плоткінай засталіся жыць у Польшчы, дзе яны арандавалі млын і адначасова гандлявалі. Спачатку Плоткіна прэцавала ў саўгаспадарцы ў Полацкай акрузе настаўнікам яўрэйскай школы. Будучы настаўнікам, Плоткіна, каб прасунуцца далей, прыняла за культасьветную працу, зрабілася актывісткай, і, урэшце, мясцовай арганізацыяй была камандыравана на педагагічны факультэт ВДУ.

Прыехаўшы ў Менск, Плоткіна атрымала стыпендыю і пачала вучыцца. Плоткіна вельмі часта пісала да бацькоў у Польшчу лісты, у якіх паведамляла, што кантрабандным шляхам магчыма многа чаго збыць у Беларусі. Гэта запіканіла бацькоў Плоткінай, і яны прыслалі ў Менск да Рывы-Мэры яшчэ адну дачку—Сару з партыяй кантрабандзкага тавару. Сара (па мужу Белкінд) прыехала ў Менск пад відам пагасьціць у сястры, зьбыла разам з Рывай-Мэрай Плоткінай кантрабанду і паступіла курсанткай на педагагічныя курсы. Перапіска паміж Рывай Плоткінай і бацькамі вялася вельмі акуратна, прычым пераважна на тэму, як разгарнуць працу па перасылцы кантрабандных тавараў у БССР. Апошні раз бацькі Рывы-Мэры Плоткінай прыслалі натотуны ліст: «Дзеці, да вас езде цёця Геня Лейкінд; спаткайце яе ў Негарэлым, але будзьце вельмі асьцярожны». Багатую Геню Лейкінд Рыва-Мэра Плоткіна спаткала ў Негарэлым. Скрыні з кантрабандай былі прывезены ў Менск на кватэру Плоткінай. Тут былі коцікавыя польты, розныя панчохі, хусткі, суконныя польты і іншыя рэчы. Але раніцай, калі яшчэ Плоткіна адпачывала, кантрабанда была затрымана, і Плоткіна апынулася пад судом. Менскі акруговы суд прыгаварыў Рыву-Мэру Плоткіну на адзін год зьняволеньня ўмоўна, а на Геню Лейк ад накладзеня штраф у адміністрацыйным парадку.

Д. Іастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Растратчыкі.

Старшыня Магілёўскага крэдытнага т-ва Поліс і член праўленьня Філоваў вялі справы т-ва так, што амаль усе пазыкі вядаліся толькі кулакам, прычым у большым разьмеры, чым гэта прадугледжана статутам. Апроч гэтага, яны растрацілі да 2000 р. казэнных грошай, а каб схаваць «сьляды», прадставілі фіктыўныя дакументы. Магілёўскі акр. суд прыгаварыў Поліса і Філонава на 3 гады зьняволеньня кожнага.

Сродкі на ўзмацненьне савхозаў.

На разьвіцьцё асноўных сродкаў вытворчасьці савецкіх гаспадарак Белсельтрэсту вызначана на бягучы год 1.999.600 руб. З гэтай сумы на капітальны рамонт і будаўніцтва будынкаў 491.600 руб., на набыцьцё мёртвага інвэнтару—191.000 руб., на набыцьцё рагатай і рабочай жывёлы—375.000 руб., на ўзмацненьне сельска-гаспадарчай прамысловасьці—826.000 руб., рэшта на іншыя капітальныя затраты.

Школьнае будаўніцтва ў Менскай акрузе.

Прэзыдыум Менскага акрвыканкому адпусьціў 222.000 руб. на школьнае будаўніцтва ў Менскай акрузе.

На гэтыя гроші будуць закончаны 20 прымітыўных школ і будуць пабудаваны 25 новых прымітыўных школ і сямігадовая школа ў Барысаве.

НОВЫЯ КНІГІ.

Выйшлі з друку і паступілі ў рэдакцыю газ. «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кніжкі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва:

1. «W Przestovy zycia» Якуб Колас стар. 128, цана 1 руб. Пераклаў з беларускае мовы І. Мірэцкі.

2. „Młody bolszewik" стар. 16 цана 10 кап. п'еса ў 3-х актах.

3. «Położenie kobiety pracującej w Polsci» M. Pomowska стар. 97, цана 40 кап.

4. „W Zmockej paszczy" п'еса ў 1-м акце стар. 16, цана 10 кап.

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ.

Менская акруговая спартакіяда

Футбол.

10 чэрвеня на плядоўцы «Прафінтэрн» адбыўся футбольны матч паміж камандамі саюзу Металістаў і БДУ, які скончыўся з вынікам 1:0 на карысьць каманды БДУ. Трэба адзначыць, што абедзьве каманды гулялі вельмі грубя, што трэба ў корані ў далейшым зьнічыць.

Баскетбол.

На плядоўцы «Прафінтэрн» адбыўся баскетбольны матч паміж жаночымі камандамі саюзу Савгандлькслужачых і Зах. чыгунак. Апошняя каманда зьяўляецца мацнейшай у Менску, і матч асабліва цікавасьці ня меў, бо чыгуначніцы лёгка атрымалі перамогу з вынікам 25:3.

Неабходна адзначыць добрую выгравасьць і асабліва пасоўку каманды—пераможніцы.

Мінусам толькі выяўлялася адсутнасьць нападаньняў. Асабліва добра вяла гульню т. Макарэвіч. Склад каманды пераможніцы: Шілепкан, Сошка, Макарэвіч, Груэд і Каравай.

Судзіў матч т. Данцыг.

Вэлёсыпэдныя гонкі.

11 чэрвеня гурток фізкультуры саюзу Харчавікоў правёў вэлёсыпэдныя дарожныя гонкі на 30 вёрст. Першае месца заняў малады вельмі здольны фізкультураўнік—рабочы заводу «Варшавянка»—тав. Рапапорт. Т. Рапапорт будзе моцным канкурэнтам на ўсебеларускіх вэлёсыпэдных спаборніцтвах. На другім месцы—т. Брэйво (зав. «Беларусь»).

Папраўка.

У № 134 нашай газэты (за 13-VI г. г.) на 2-й старонцы ў справаздачы аб «3-м зьезьдзе ўпаўнаважаных Белкаапсаюзу» ўкралася памылка: надрукавана: „Даклад... зрабіў т. Агрэаўскі", а трэба: „Даклад... зрабіў тав. Гарноўсі.

„Савецкая Беларусь" дапамагла.

„Селькорка" Сьвірыноўская выключана з камсамолу.

У допісу «Пад вывескай селькора» СЕЛЬКОРАМ нашай газэты выкрываліся кулацкія справы „селькоркі" Сьвірыноўскай Цыры (з пасёлку Грэбальні, Крупіцкага сельсавету, Самахвалавіцкага раёну). Бацька яе мае пасьля абрэзкі і2 дзес. зямлі, 7 кароў, 2 бугаі, 3 коняй, а дочка фантычна зьяўляецца гаспадыняй карчмы.

Гэтым Сьвірыноўскія ўлетку наймаюць па 5-6 парабкоў, а 2 трымаюць заўсёды і бяз усякага дагавору. Сыны „гаспадара" гандлююць мясам, а парабкі косяць ваду, колюць дровы і жывуць у самых жудасных умовах. Аб гэтым шмат хто ведае, але за „задок мяса" маўчаць і выдае падарункам», (зьмешчаны ў „С. Б." № 107 ад 11-5 г. г.) адзначаў бяздзейнасьць Запольскага КСР ў веснавую пасеўкампанію. Рагачоўскі РайКСУ паведамляе, што старшыня Запольскага КСУ за нядбайнасьць зьнят з працы, а заместа яго выдвінуты больш актыўны працаўнік. К-ту даручана дырэктывы. Гэта палепшыла працу.

БЛЫТАНІНА РАЗБЛЫТАНА.

У „С. Б." № 295 ад 29-XII 1927 г. была зьмешчана заметка «СЕЛЯНІНА» „Блытаніна ў земляўпарадкаваньні". «Селянін» пісаў, што Вузьдзенская райземкамісія направільна праводзіла перасяленьне на пасёлак гр-н з в. Паўлаўшчына пры землеўпарадкаваньні.

Бюро скаргаў НКРСІ паведамляе, што Менск. акр. земкамісія адмяніла пастанову Вузьдзенскай райземкамісіі ў тэй частцы, дзе гаворыцца, што гр-н Колас Базыль павінен быў за свой кошт перанесьці будынкі Коласа Пятруся.

БЮРАКРАТУ АШМАНУ ПАСТАЎЛЕНА НА ВІД.

У сувязі з заметкай, зьмешчанай у „Савецкай Беларусі" № 107 ад 11-5 г. г. пад назвай «Бальнічныя бюракраты» Н. З. аб бюракратычных адносінах галоўнага 2 гарадзкой сва. бальніцы АШМАНА да хворай сялянкі Рубцовай, Менскі Гарадзкі інспэктар Аховы Здароўя за невыманьне Ашманым расправадж. Нарыман. Аховы Здароўя аб зьмешчаньні ў больніцу сялянкі Рубцовай паставіў яму на від.

ВІНАВАТЫХ ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ.

У „С. Б." № 126 ад 2 чэрвеня г. г. была зьмешчана заметка «Злачынная безгаспадарнасьць». У заметцы высьвятлялася, як у Веткаўскім р-не (Гомельшчына) калёнія «Воля» з прычыны злоўжываньняў адміністрацыі, безгаспадарнасьці начальніка даведзена да поўнага заняпаду.

Па прапанове РСІ вінаватыя ў гэтай безгаспадарнасьці прыцягваюцца да судовай адказнасьці.

ЛЯСНЫЯ «СПЭЦЫ» БУДУЦЬ ПАКАРАНЫ.

У „С. Б." № 100 ад 1-5 1928 г. была зьмешчана заметка «З пацукоў вырасьлі ваўкі» (ліст дзесяці сялян). У заметцы выкрываліся злоўжываньні аб'ектыва Грэскага л-ва, Гальца Дзяніса, які за самагонку правіваў дзяржаўны лес і потым на невінаватых сялян з сакратаром сельсавету Цьвірком Вясілём беспадстаўна пісаў пратаколы, а РВК накладаў штрафы.

Расьсьледваньнем пракуратуры 5 вуч Менскай акругі фанты, пазнаныя ў заметцы, пацьвердзіліся. Справа накіравана сьледчаму для прыцягненьня Гальца Дзяніса, Цьвірка Базыля і дзелавода Грэскага л-ва Жалкоўскага да адказнасьці.

ЗЬНЯТ З ПРАЦЫ ЗА НЯДБАЙНАСЬЦЬ.

Селькор Я. КРУШЫНА ў сваім допісу «Камітэты на дапамогу бяднотным гаспадаркам», (зьмешчаны ў „С. Б." № 107 ад 11-5 г. г.) адзначаў бяздзейнасьць Запольскага КСР ў веснавую пасеўкампанію. Рагачоўскі РайКСУ паведамляе, што старшыня Запольскага КСУ за нядбайнасьць зьнят з працы, а заместа яго выдвінуты больш актыўны працаўнік. К-ту даручана дырэктывы. Гэта палепшыла працу.

Яшчэ адна дасьледчая ўстанова.

У хуткім часе на балотным торфяным масыве каля станц. Міхановічы (Заходняя чыгунка) будзе адчынена цэнтральная беларуская дасьледчая торфяная станцыя.

Балотны абшар у 300 гэктараў ляжаў да гэтага часу бяз ужытку. Толькі часам асобныя адзінкі-сяляне пачыналі капаць там торф і, выбраўшы 4 куб. мэтраў торфяной масы, кідалі працу. Балота недаступнае і працаваць на ім ня было ніякай магчымасьці.

Зараз на гэтым балоце праведзена значная падрыхтоўчая праца, у падове чэрвеня на ім адбудзецца ўрачыстае адчыненьне торфяной станцыі. Пасьля адчыненьня загудзе рухавік, у мяккую торфяную масу ўрэжуцца новыя ўдасканаленыя машыны. Рабочых—«бягуноў», якія бегалі да гэтага часу па калені ў вадзе, адносячы ад дапатопных торфакапалак здабыты торф, ня будзе.

Новы торфакапальны камплект машын (рыдлёвы, спецыяльны і мо...) ...ноў крытых ад вады „бягуноў". Транспарцёр новае машыны павольна, але пэўна і без перапынку будзе адвозіць ад машыны торф туды, куды яго накіруе рабочы. Каштуе новая машына 30 тысяч руб., але затое яна і выпрацуе ў некалькі разоў больш, чым звычайная старая машына.

Адчыненьне станцыі мела адбыцца 13 чэрвеня, але завод „Мэтал" падвёў: адна частка машыны («мундштук») прыбыла на балота паламаною. Завод «Мэтал» узяўся пастроіць яе ў «сьпешным» парадку і ўзяў 120 руб. за «тэрміновасьць», паабяцаўшы зрабіць яе да 9 чэрвеня. Аднак, сёньня ўжо 14 чэрвеня, а „мундштук" усё яшчэ не гатоў.

У зьвязку з гэтым адчыненьне станцыі адкладзена да 19 чэрвеня. На адчыненьне станцыі з Менску ў Міхановічы выяжджаюць прадстаўнікі савецкіх, навукова-дасьледчых і прамысловых устаноў.

Карысная праца вандроўнага тэатру „Полымя".

Вандроўны беларускі тэатр «Полымя» быў арганізаваны ў кастрычніку 1927 г. ЦК саюзу працаўнікоў зямлі і лесу дзеля абслугоўваньня батракоў і сяброў саюзу на вёсцы, а разам з тым і сялянства. Калектыў артыстаў тэатру, праўда, невялікі—ён зараз налічвае ўжо 11 асоб, але затое гэты калектыў моцна спаяны адзінай ідэяй прасоўваньня беларускага мастацтва ў самыя глухія куточкі БССР. У складзе калектыву ёсьць 2 прафесыяналы, а рэшта — аматары; ёсьць сярод іх адзін цымбаліст і адзін скрыпач.

Умовы працы тэатру вельмі цяжкія: напершае—увесь час у разьездах, а падругае—вечны недахоп сродкаў, бо спэктаклі ставяцца пераважна бясплатныя. У рэпэртуары тэатру налічваецца 10 п'ес, сярод якіх: «Чортава кубыня», «Госьць з катаргі», «Найміткa» і інш.

З часу арганізацыі да 1 чэрвеня г.г. тэатр ужо зрабіў вялікае падарожжа па Менскай і часткова па Бабруйскай округах (праехалі каля 1000 кілёмэтраў). Тэатр за гэты час пасьпеў наведаць 59 савхозаў, 17 мястэчак, 10 вёсак і 2 гарады. У гэтых пунктах пастаўлена 158 спэктакляў, якімі абслужана 20141 чал., з іх 1200 батракоў, 9760 членаў саюзу працаўнікоў зямлі і лесу, а рэшта, галоўным чынам,—сялянства.

Пасьля спэктаклю кожны раз наладжвалася канцэртнае аддзяленьне, у праграму якога ўваходзілі: беларуская нацыянальная музыка, дэкляманцыя, сьпевы і скокі.

Ня толькі ў вёсцы і савхозах, але і ў мястэчках тэатр «Полымя» карыстаўся надзвычайным посьпехам. Можна прывесьці шэраг прыкладаў, калі на спэктаклі сяляне прыходзілі за 10—15 кілёмэтраў. Усюды, дзе толькі тэатр іграў, яго прасілі застацца надалей.

Тэатр не абмяжоўваўся толькі пастаноўкамі спэктакляў і канцэртаў: адначасова ён веў вялікую працу сярод мясцовых драмгурткоў, сябры якіх заўсёды прысутнічалі пры падрыхтоўцы да спэктаклю і вучыліся працаваць. Тэатр па ўсім сваім падарожжы інструктаваў і даваў указаньні ў працы мясцовым драмгурткам.

Зараз тэатр прыехаў у Менск і будзе абслугоўваць ваколіцы Менску, а потым паедзе на Бабруйшчыну. Не зважаючы амаль на штодзённыя пастаноўкі, тэатр кожны дзень вядзе ўпартую працу па падрыхтоўцы новых пастановак.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

КІНО.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».	Два фільмы за адзін сэанс. I „Два дня" грандыёзны фільм у 7 частках. II „Мнимый аторней" камэдыя ў 6 част.
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	ВЫДАТНЫ ФІЛЬМ „ЦЫРК ПОМЭРА". У гал. ролі—вядомы спартсмэн Мацыст.
КІНО «ПР